„Через річку, через гай” ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Стары Ольса ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 25 (2771) Год LIV | Беласток, 21 чэрвеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Нашы ў выбарах

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Несумненна, аб поспеху ў выбарах у Еўрапейскі парламент 7 чэрвеня можа гаварыць гісторык прафесар Антон Мірановіч, які стартаваў з чацвёртай пазіцыі спіска Грамадзянскай платформы са спалучанай падляшскай і вармінска-мазурскай акругі. Агулам атрымаў ён рашуча больш за два разы галасоў чым іншы кандыдат, адкрыта дэкларуючы беларускую нацыянальнасць — Ян Сычэўскі, старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства, які стартаваў таксама з чацвёртай пазіцыі, але са спіска Саюза дэмакратычнай лявіцы — Уніі працы. Сярод кандыдатаў з падляшскай часткі выбарчай акругі ні аднаму не ўдалося ўвайсці ў Еўрапарламент. Яўка, як можна было меркаваць у маштабе ўсяе краіны і Падляшскага ваяводства, не была імпазантнай і склала адпаведна 24,5% і 21,7%.

Некаторых выбарчых назіральнікаў мог задзівіць вынік прафесара Антона Мірановіча, хоць адзін з найбольш папулярных тыднёвікаў тыдзень да выбараў намякаў, што павінен ён апынуцца сярод еўрадэпутатаў: „Чым больш еўрадэпутатаў, разумеючых вагу адносін з усходнімі суседзямі ЕС, тым лепш для Польшчы”. Канчаткова праф. Мірановіч агулам здабыў 8 133 галасы, што разам з галасамі адданымі на Яна Сычэўскага (3 499) магло б даць сама найменш аднаму кандыдату з беларускага асяроддзя мандат у польскім парламенце, вядома, пры прадпасылцы, што беларускае асяроддзе балатавала б адзін спісак, а такі камітэт перакрочыў бы пяціпрацэнтны выбарчы парог. Вынік праф. Мірановіча паказвае таксама палітычным групоўкам, што варта на яго ставіць таксама ў будучых выбарах. Сам прафесар ужо пасля выбарчай нядзелі сказаў „Ніве”:

— Я ацаняю мой вынік як добры. Напэўна трэба яго выкарыстаць у наступных выбарах, напрыклад, у самаўрад.

Прафесар Антон Мірановіч, напрыклад, перамог Яна Сычэўскага ў Беластоцкім (987 галасоў да 358), Гайнаўскім (841 да 799), Сямятыцкім (405 да 290), Сакольскім (148 да 115) паветах. У сваю чаргу Ян Сычэўскі выйграў з Антонам Мірановічам у Бельскім павеце (739 да 683). Цікава, што адносна шмат галасоў было аддадзеных на праф. Мірановіча напр. у Эльблангу (191), Ломжы (106) і Ольштыне (248), у Аўгустоўскім (102), Гіжыцкім (162) ці Шчытненскім (109) паветах. Таксама ў самім Беластоку праф. Мірановіч рашуча перамог Яна Сычэўскага. У сваю чаргу Ян Сычэўскі ў іншых, „небеларускіх” паветах і асобных гарадах са статусам паветаў здабыў ледзь ад некалькіх да дваццаці галасоў. Папрошаны намі пракаментаваць свой выбарчы вынік, ён заявіў:

Ян Сычэўскі і Антон Мірановіч у час дэбаты на радыё Рацыя

— Што тут каментаваць. Якія ёсць факты — відаць.

— А як Вы ацэньваеце выбарчыя вынікі ў маштабе ўсяе краіны і нашай выбарчай акругі?

— Адмоўна. Ніхто ў ЕП не будзе прадстаўляць Падляшскага ваяводства.

— Ці намерваецеся Вы прыняць удзел у чарговых самаўрадавых, парламенцкіх выбарах?

— З цяперашняй перспектывы не ўмею ацаніць, ці буду стартаваць.

Пры нагодзе праверылі мы як галасавалі ў выбарчым пункце ў Аўгустове, распаложаным непадалёк вёскі Стрыкі (Бельскі павет), з якой родам Ян Сычэўскі. Здабыў ён там 35 галасоў падтрымкі (Антон Мірановіч — 8) на аддадзеных агулам 65 галасоў, з якіх — 43 на спісак СЛД-УП.

Нейкага роду неспадзеўкай аказаўся таксама вынік падляшскага віцэ-маршалка Мечыслава Башко, пастаяннага жыхара Сакольскі, ахвотна валодаючага беларускай мовай, які стартаваў з апошняй пазіцыі ПСЛ. Рашуча перамог ён у гміне Дубічы-Царкоўныя. „Пабіў” і Антона Мірановіча, і Яна Сычэўскага, і іншых кандыдатаў, здабываючы 46 галасоў падтрымкі з 50 аддадзеных тут на пераможны спісак ад ПСЛ. Падобна было і ў Чыжоўскай гміне. Башко здабыў падтрымку 65 галасуючых (на пераможны ў гміне спісак ПСЛ прагаласавала 89 асоб). Да выбараў гаварыў:

— Каб увайсці ў Еўрапарламент, вельмі важна, каб быць распазнавальным не толькі ў Сакольскім павеце.

У Сакольскім павеце М. Башко атрымаў 1 965 галасоў (у самой Саколцы — 893). Для прыкладу, у Беластоцкім павеце — 486, Бельскім — 173, Монецкім — 308, Гайнаўскім — 176, Сямятыцкім — 165, а ў горадзе Беласток — 178. Агулам на Мечыслава Башко прагаласавала 3 923 выбаршчыкаў (трэці вынік на спіску).

Збіраючы для чытачоў „Нівы” выбарчы матэрыял, наткнуліся мы на некалькі сюрпрызаў. Вось, напрыклад, раніцай назаўтра пасля выбараў (не было яшчэ тады вынікаў апублікаваных Дзяржаўнай выбарчай камісіяй), калі папрасілі мы адну чыноўніцу ва Управе горада і гміны Кляшчэлі падаць нам вынікі, пачулі: „Ой, даруйце, але пан бурмістр выйшаў з установы, забраўшы вынікі, а другога экземпляра ў нас няма...” У сваю чаргу ў іншым гмінах не хапала ўвогуле зборных даных, як гэта бывала зараз жа пасля іншых выбараў. Марэк Рыбнік, дырэктар беластоцкай дэлегатуры Краёвага выбарчага бюро заявіў у размове з намі:

— У гэтых выбарах вынікі вывешваліся ў выбарчых участках пасля іх перападліку і перасылаліся непасрэдна ў КВБ. Таму вось управы гмін не мусілі ў гэты раз апрацоўваць сваіх зборных даных, хіба што самі чыноўнікі бачылі такую патрэбу.

Лік галасоў аддадзеных на Антона Мірановіча і Яна Сычэўскага, а таксама яўку і вынікі пераможных груповак у паасобных гмінах, у якіх у значнай частцы пражывае беларускае насельніцтва, прадстаўляе наша табліца (стар. 11). Заўвага. У выпадку Міхалова, Саколкі і Крынак, якія маюць горада-вясковы статус, прадстаўляем вынікі выключна гмін, паколькі — як тлумачыў Марэк Рыбнік — камп'ютарная сістэма КВБ „не ўмела знайсці адпаведны метад перападліку галасоў для такіх гмін”. Было прынята, што вынікі такіх гарадоў будуць уключаны ў агульнагмінныя вынікі, а таксама будуць падавацца вынікі з паасобных акруговых камісій (школы, святліцы, дамы культуры і гд.).

(прыкладныя вынікі на 11 старонцы)

Малочная рака ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

У Беларусі з Расіяй чарговы скандал. Ён ужо нават атрымаў назву — малочны. Хіба таму так назвалі, што гэтых скандалаў шалёная безліч і трэба неяк адрозніваць адзін ад другога. Хаця, калі прыгледзецца больш уважліва, то аніякай розніцы паміж імі і няма...

Дасье ☞ 2

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Лістаючы інтэрнэт-старонкі можна часам заўважыць нешта цікавае. Вось, са значным спазненнем, трапіў я там на тэкст Цэзара Гмыза, прысвечаны колішняму сакрэтнаму супрацоўніцтву цяперашняга першастаяцеля Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы...

„Калыска” ў Гацьках ☞ 4

Ян МОРДАНЬ

Свята ў Орлі ☞ 5

Міхал МІНЦЭВІЧ

Герой ці бандыт ☞ 9

Міра ЛУКША

Сустрэчы „Зоркі” ☞ 12

Фотарэпартаж

9 770546 196000

Малочная рака

У Беларусі з Расіяй чарговы скандал. Ён ужо нават атрымаў назву — малочны. Хіба таму так назвалі, што гэтых скандалаў шалёная безліч і трэба неяк адрозніваць адзін ад другога. Хаця, калі прыгледзецца больш уважліва, то аніякай розніцы паміж імі і няма.

Увогуле існы беларускі рэжым без скандалаў жыць не можа. Не тая натура. Каб нешта рабіць стваральнае, яму трэба заўсёды з некім змагацца. А то вельмі нудна, з суму можна здохнуць. А вось паваяваць — гэта самы раз. Прычым біцца да канца, да поўнай перамогі, да апошняй кроплі крыві. Зразумела, што не сваёй.

Пачалося ўсё з бел-чырвона-белай сімволікі і беларускай мовы. Гэтыя нацыянальныя святыні атрымалі першы ўдар. Сімволіку памянялі, мову прыраўнялі да акупацыйнай, чужацкай. Пасля паганялі на вачах усяго свету абраннікаў беларускага народа — дэпутатаў. Крыху ўрэзалі па іх дэпутацкім імунітэце недатыкальнасці. А пасля і ўвесь свет паганялі. Выперлі к чорту ўсіх замежных паслоў прэч, акрамя, зразумела, тых, хто добра валодаў другой дзяржаўнай мовай Беларусі.

І нават на сустрэчу з прадстаўнікамі таго самага Міжнароднага валютнага банка, на які зараз моляцца як на абразы, не збіраліся завітваць. А навошта? Грошы мусіла даваць Расія. Трэба ж плаціць за другую дзяржаўную беларускую мову і саюзную дзяржаву. І яшчэ за тое, што мы з імі сябруем (прынамсі, хоць на словах сябруем, бо іншыя нават на словах сябраваць не хочуць). Ну вось, хай бы і плацілі. І ўсё было б добра, усё было б як і дагэтуль. Звычайныя грамадзяне гаварылі б паруску, дэпутаты ўвогуле не гаварылі б ні на якой мове, а толькі, як ёлупні, ківалі б у знак згоды, а заходняя мяжа была б на самым моцным замку, бо праз яе на Захад лілася б агульнасаюзнадзяржаўная нафта.

І ніхто ні пра якое малако і не думаў бы. А зараз федэральная служба Расіі па наглядзе ў сферы абароны правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека, забараняе ўвоз на сваю тэрыторыю каля паўтары тысячы назваў беларускіх малочных вырабаў. Кажуць, не адпавядае нейкім там нормам. Ну насмяшылі. У Расіі нейкія нормы ўзяліся. Ніколі не было, а тут на табе, ёсць. Дзе ўзялі — ніхто не ведае. І не на гарэлку, а на малако. Здохнуць можна ад смеху.

Цяпер расійскія млекакормячыя будуць запіваць малаком з нормамі. Вось толькі катоў шкада, бо ў адрозненні ад Расспажыўнагляду яны маюць уласныя, а не пуцінскія, мазгі, і, прызвычаіўшыся да беларускага малака, на абы-што наўрад ці захочуць пераходзіць. Ды і не трэба хіба што тым катам мяняць свой рацыён. Малако як цякло ў Расію, так і будзе цячы. У разе чаго можна будзе памяняць назву на яшчэ не забароненую.

А можам увогуле адмовіцца ад сістэмы сумеснай супрацьпаветранай абароны. Як тады Пуцін з Мядзведзевым запяюць. Бо нам тая сістэма непатрэбная. Нас ніхто бамбіць не будзе. Прэзідэнт ездзіў за мяжу і пра ўсё дамовіўся. А калі і будуць бамбіць, то толькі крэдытамі Міжнароднага валютнага банка.

А малако ў Расію можна перавезці кантрабандай. Як ніяк — саюзная дзяржава. Ні для людзей, ні для танкаў, ні для малака мяжы быць не павінна. А хто яе робіць, той саюзную дзяржаву і разбурае. Прынамсі, так заявіў беларускі лідар на сустрэчы з расійскімі журналістамі яшчэ да скандалу з малаком. Бо смех смехам, але ўсе чамусьці з таго смеху сталі забывацца, што малочны скандал пачаўся з таго, што Расія не дала Беларусі абяцанага крэдыту. І як сказаў начальнік беларускай дзяржавы, яны нам адпомсцілі за тое, што мы не прызналі незалежнымі краінамі адабраных Расіяй у Грузіі тэрыторый. І на гэты раз беларускаму кіраўніку паверылі ўсе. Увесь свет, і нават усе беларусы.

Так што беларуская малочная рэчка пачынаецца недзе ў гарах Абхазіі і куды зацячэ, халера яе ведае. І ніхто не ведае колькі высокапастаўленых чыноўнікаў у ёй патопяцца, асабліва расійскіх. А наш урад выйграе і гэтую вайну з Расіяй, як выйграў з ёй газавую вайну, як выйграў з прызнаннем усёй Еўропай нас дэмакратычнай краінай, як выйграў з дэпутатамі, якія так дамагаліся калісьці імпічменту. Бо ў нас да скандалаў звычка, вопыт і практыка. А ёсць куды дзець нам малако, ці няма куды дзець, гэта ўжо не так істотна.

Віктар САЗОНАЎ

Дасье

Лістаючы інтэрнэт-старонкі можна часам заўважыць нешта цікавае. Вось, са значным спазненнем, трапіў я там на тэкст Цэзара Гмыза, прысвечаны колішняму сакрэтнаму супрацоўніцтву цяперашняга першастаяцеля Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Змест артыкула цікавы, аднак не буду я тут перапісваць перапісанага, значыць, прыводзіць вытрымак з „апостальскіх энцыклік", адрасаваных тадышнім „властям и воинству" ці называць намінаваныя ў залатоўках-срэбраніках эквіваленты за іх. Прысвячу я слоў пару крыху шырэйшай абалонцы, таму нашаму павуцінню, у якое трапляюцца не толькі мухі, але і вялікія шышкі.

Вандрую я не толькі па інтэрнэце, але вандрую я таксама па нашых фізічных дарогах і бездарожжах. І вось, сузіраючы наша памежжа, якое памежжам стала ў не надта адлеглы час, пацікавіўся я вытокамі ўстанаўлення побач нас дзяржаўнай граніцы і тымі падзеямі, якія гэты працэс суправаджалі.

Перад еўрапарламенцкімі выбарамі ў польскіх сродках масавай інфармацыі была голасна агучана справа высялення немцаў пасля другой сусветнай вайны; пры нагодзе згадвалася і пра высяленні палякаў. Высяленняў было больш, у тым ліку і прымусовых цераз новаўстаноўленую польска-савецкую мяжу. Афіцыйна адбылося гэта згодна тадышнім дамовам Масквы з Варшавай.

Менш афіцыйна адбылося гэта згодна з дзесятай запаведдзю: не жадай раба блізкага твайго, ні рабыні яго. У два першыя пасляваенныя гады з тэрыторыі тадышніх Люблінскага, Жэшаўскага і Кракаўскага ваяводстваў у Савецкі Саюз былі прымусова выселены амаль паўмільёна украінцаў, якіх саветы лічылі „сваімі". Перад перадачай Польшчы ў 1948 годзе падгродзенскіх Хварасцян саветы выселілі ў сваю глыбінку ўсё праваслаўнае насельніцтва гэтай вёскі...

Больш-менш афіцыйна адбылося гэта і дзеля высялення „нежаданых этнічных груп", як называлі меншасці ў сталінскі час. Вось што пісаў загадчык пасляваеннай дэлімітацыйнай камісіі ў Саколцы: «*Ze wsi, które przychodzą do Polski, mianowicie: Usnarz Górny, Grzybowszczyzna, Jurowlany — wszystkie są zamieszkałe w stu procentach przez Białorusinów, jednak Grzybowszczyzna posiada około 40% Polaków, porządanym (sic!) byłoby gdyby ludność wsi Harkawicze, Jurowlany, Usnarz Górny oraz ludność wsi Grzybowszczyzna przesiedlić na teren BSRR — przede wszystkim zaś ludność wsi Harkawicze, co do której zapatrywania polityczne nieraz skupiały się „na mojej skórze" jako Naczelniku Oddziału*».

Гэтай ахвоты высялення з Польшчы нежаданых груп насельніцтва Харон не выселіў яшчэ за Стыкс, яна, насуперак афіцыйнай касметыцы, яшчэ дыхае. Бо, для падручнага прыкладу: чаму свет пабачыла дасье „Юрка", а не могуць на яўны свет прабіцца галосныя „ўдачы" іншых чыноў, напрыклад славутага „Болька"? Мне здаецца, што іх няма, што аператыўныя зводкі, калі такія захоўваліся ў архівах спецслужб, былі ў свой час знішчаны; толькі не ўсе — неяк так мне зноў падаецца, што былі захаваны поўныя папкі некаторых важных асоб з „нежаданых" груп...

Сербскі князь Аляксандр Караджорджавіч у 1855 годзе запрапанаваў паслам сваёй Дзяржаўнай рады сістэматызацыю законаў, а яны адказалі яму, што сербскі народ такі добры, як ніводзін у Еўропе, а дасканалым людзям ніякія законы непатрэбныя, яны нават ім шкодныя. І мы ж жывём у такога ж роду эдэме, у „Найяснейшай"...

Не прынёс Майсей з Сіная адзінацатай запаведзі „не ўдавай". Гэтая дзейнасць не называецца і ў пераліку грахоў, якія апостал Павел змяшчае ў ягоных яўных пасланнях карынфянам і галатам. Магчыма, што ў той час гэтая актыўнасць яшчэ не ўсялілася ў грамадскае жыццё. Найслаўнейшы багдадскі халіф Гарун ар-Рашыд, які высяліўся за Стыкс роўна 1200 гадоў таму, сам здабываў патрэбныя яму сакрэты, апранаючы на базар маскарадны касцюм просталюдзіна. Але наш час іншы...

Якое семя, такое і племя, кажа народная прыказка. Публікуючы дасье нашага сейбіта духоўных каштоўнасцей намінальны пан Гмыз быццам падказвае: пабачце, які пастыр у гэтай паствы, якая гэта паства: ці не прадажная, ці не „*porządanym byłoby gdyby ludność... przesiedlić na teren BSRR*". Такім вось чынам з колішніх сакрэтных дзеянняў, быццам шыла з мяшка, вылазіць навонкі і менш вачавіднае дасье мясцовага традыцыйнага палішынеля.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Шматкультпрадукт

Нашу рэдакцыю запрасілі былі на прэс-канферэнцыю аб „новай якасці турызму ў Беластоку" ў рамках праекта „Прамоцыя Падляшша шляхам пабудовы маркі горада Беластока", суфінансаванага са сродкаў Еўрасаюза з Еўрапейскага фонду рэгіянальнага развіцця аператыўнай праграмы Падляшскага ваяводства на 2007-2013 гады". Уф-ф-ф! Яшчэ да яе пачатку прачытаў я ў матэрыялах, падрыхтаваных для медыяў: „Ад пачатку сакавіка 2009 г. працягваліся працы над новымі турыстычнымі прадуктамі Беластока (...). Сёння бачым канкрэтныя эфекты гэтых прац. Гэта перш за ўсё апрацаваны гарадскі турыстычны прадукт „Эсперанцкі Беласток", падставай якога з'яўляецца турыстычны шлях „Шляхам эсперанта і многіх культур". Неўзабаве ў гарадской прасторы Беластока стануць паяўляцца шыльды з інфармацыяй аб чарговых атракцыёнах на шляху. Агулам будзе іх 18". Губерт Ганэра з познаньскай фірмы, якая займаецца прамоцыяй Беластока, доўга тлумачыў журналістам як будуць выглядваць тыя шыльды. Прытым прыгадаў, што „Эсперанцкі Беласток" гэта адзін з трох прадуктаў, прамуючых Беласток. Два апошнія гэта „Кулінарны Беласток" і „Шматкультурны Беласток". Мабыць, не будзеце здзіўленымі, што мяне зацікавіў гэты апошні прадукт. І хоць аб ім было найменш гаворкі, я спытаўся ў прысутных на канферэнцыі прэзідэнта Беластока Тадэвуша Трускаляскага ды Губерта Ганэру, з якімі меншаснымі асяроддзямі „прадукт" кансультаваўся; вядома, меў я на думцы перш за ўсё беларускія арганізацыі. Пасля кароткай паўзы нейкая маладая дама ў рашучым тоне адказала мне:

— Яшчэ ў красавіку кансультаваліся мы са Звязам беларускай моладзі і Беларускім аб'яднаннем студэнтаў.

— А што з гэтых кансультацый дагэтуль вынікла? — дапытваўся я.

— Працягваюцца работы над апрацоўкай гэтага прамацыйнага прадукту.

І столькі я даведаўся наконт гэтага.

Назаўтра э-мейлем запрасіла мяне тая самая маладая дама на сустрэчу. У гэты раз старалася больш дэталёва расказаць аб прамацыйных задумах „Шматкультурнага Беластока".

— З ліку дзейнічаючых у Беластоку арганізацый запрасілі мы да супрацоўніцтва ЗБМ, БАС і Згуртаванне „АБ-БА", хоць нашы падрадчыкі [тая познаньская фірма, якая займаецца прамоцыяй — М. Х.] заўважылі ў сваім дакуменце, што ў Беластоку адбываюцца мерапрыемствы, рыхтаваныя выключна БГКТ і Таварыствам беларускай культуры. А гэтым арганізацыям не хапае новых ініцыятыў шырэйшага грамадскага характару.

У рамках „Шматкультурнага Беластока", падобна як і ў выпадку „Эсперанцкага Беластока", маюць паявіцца на вуліцах горада інфармацыйныя шыльдачкі, а таксама ў цэнтры горада будзе збудаваны гадзіннік, паказваючы даты паводле каталіцкага, праваслаўнага, мусульманскага і яўрэйскага календароў. Мае быць апрацаваны дапаможнік для настаўнікаў і вучняў аб тым, што „ў Беластоку жывуць не толькі палякі і каталікі". У ваколіцах чыгуначнага вакзала стане электронны слоўнік, дзякуючы якому турысты змогуць перакласці сабе на „нармальную" мову словы „гаворак", якімі карыстаюцца беластачане. Мае быць таксама „Лавачка згоды", на якой — як заяўляюць прамотары — усадавіліся б (як разумею, гаворка пра скульптуры) „поп, рабін, ксёндз і імам". Вось такім чынам шматкультурны Беласток намерваюцца прамаваць. Несумненна, да тэмы вярнуся.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

У Петразаводск: „через річку, через гай”

Гэта не высахлая рэчка, а класічная расійская дарога

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Пакідаючы Расію, не ведаю ці мне жаль, ці ўжо можна цешыцца думкай аб родных падляшскіх краявідах. Краявіды можа гэта якраз не самая важная прычына з-за якой хочацца дахаты. Кулінарныя звычаі, людзі, дарогі... Дарогі! Цяжка паверыць, што можна тужыць па разбітай вузкай дарозе з Беластока ў Міхалова праз Жэдню, ці з Нарвы ў Бельск. Гледзячы якраз на дарогі лёгка зразумець, што да заходняй часткі Еўрасаюза нам, жыхарам Падляшша, а затым і палякам агульна кажучы, яшчэ далёка. Тады і лёгка зразумець чаму, едучы ў Расію, бывае, што пападаеш у азіяцкую зону працы мабільнікаў (што абазначае ў пару разоў даражэйшы кошт сувязі!). Пакуль, аднак, мы трапілі ў Карэлію — мэту нашага падарожжа, у гэтую „азіяцкую” частку Еўропы (як пазней аказалася можа і аднак найбольш еўрапейскую — што за парадокс!), хуценька перасяклі Прыбалтыку, каб пабачыць што цікавае адбываецца зараз у латышоў ды эстонцаў.

Калі мы з сябрамі даведаліся, што будзем мець нагоду паехаць у Расію, проста вочы нам загарэліся. Расія гэта не так даступная краіна, як бы здавалася. З другога боку, у свеце столькі прывабных месц, што Расія сярод іх адна з многіх. Праўда, яна так вялікая, што нават цяжка спадзявацца на нейкую аднолькавую рысу, тым больш, што мы не збіраліся ў Расію, а ў Карэлію! Гэта важная розніца, бо хаця Карэлія — частка Расійскай Федэрацыі, то і заадно часткова незалежная рэспубліка.

— Паехаць у Карэлію! Гэта цікавы вопыт! — падумалі мы і, нягледзячы на ўсялякія важныя справы ды абавязкі, селі ў старэнькі мікрааўтобус маркі „Мерседэс” і направіліся спачатку ў Рыгу.

Маіх успамінаў паўтарагадовай даўнасці, калі я шпацыравала па Рызе зімовай парой, цяперашняя рэчаіснасць зашмат не памяняла. Тады якраз супольна ўваходзілі мы ў Шэнгенскую зону. Цяпер відаць, прынамсі па выглядзе сталіцы, што грошы з касы Еўрасаюза выкарыстоўваюцца вельмі інтэнсіўна. Наўкола сталіцы гэта можа відаць менш, але там і не так шмат жыве насельніцтва краіны.

— Чаму ў іх столькі савецкіх указальнікаў? — не мог надзівіцца мой сябра. — Бо калі тут „унія”, дык чаму ж краіна надалей выглядае як савецкая рэспубліка?..

Калі над гэтым задумацца, пытанне акажацца не тупое і зразумелае, бо можа і больш за палову насельніцтва Латвіі складаюць расіяне, якіх незразумелым да канца было б перасяляць з заселеных гадамі хат ці вуліц у Расію. Такая спецыфіка Латвіі і трэба з гэтым пагадзіцца.

— Штосці са мною не так? — уголас спытаў нібыта сябе, нібыта нас адзін з бельскіх сяброў. — Не паспею адазвацца, а загаворваюць да мяне па-руску, — працягнуў думку. — А можа я разумею толькі па-англійску, — дадаў з крывой усмешкай.

Субота, дзесятая гадзіна мясцовага часу, таму турысты сустракаліся яшчэ рэдка. Нягледзячы на дзіўны раннішні настрой, мы, часам самотныя (таму момантамі і шчаслівыя) вандравалі завулкамі старога горада.

— Экскурсія, тріп! Джэрман? Інгліш? Раш'ян? — пад турыстычнай інфармацыяй шукаюць сабе заробку мясцовыя экскурсаводы.

Але мы хутка, за дзве гадзіны, пабачылі тое, што хацелі ды змаглі, селі ў мікрааўтобус і падаліся ў Талін. Пасля поўдня аглядалі ўжо эстонскія краявіды.

— І тут такія ж указальнікі... — расчараваны ці можа разжалены сканстатаваў мой сябра. — Ці тут няма скандынаўскіх уплываў?

Ёсць. Калі ўязджаеш у межы Таліна, зразу кідаюцца ў вочы прыгожыя драўляныя домікі. Некаторым напэўна каля сотні гадоў, іншыя пабудаваны відавочна паводле фінскіх праектаў, простыя, элегантныя, заадно вельмі стылявыя. Праз момант ужо пад'ехалі пад старажытныя муры талінскага старога горада. Тут зусім іншы настрой чым у Рызе, дзе гэтак званы стары горад мякка пераходзіць у раён сэцэсійных будынкаў, а тыя ўжо па-суседску з сучаснай Рыгай. Талін свой стары горад захаваў на ўзгорку. Там жыццё квітнее безупынна, кругласутачна. Адны п'юць піва, другія шукаюць сувеніраў, якія якраз у Таліне самыя дарагія ў Прыбалтыцы! На рынку рыхтуюцца да вялікага канцэрта, у парку каля муроў жанчыны спяваюць расійскія фальклорныя песні, а па вуліцах хуткім крокам прахаджваюцца маладыя людзі, спяваючы праз мегафон: „Хары-Крышна! Хары-Крышна!” Проста еўрапейская свабода быцця-жыцця. На жаль, і там былі ў нас толькі дзве гадзіны. За гэты час паспелі мы яшчэ, хаця зусім выпадкова, трапіць на вельмі блізкі нашаму сэрцу беларускі след. Пры адной з вуліц стаяў будынак з памятнай дошкай:

Да вечара трэба нам было дабрацца ў невядомае месца блізка эстонска-расійскай мяжы, недзе ў ваколіцах Нарвы. Між кароткімі момантамі адлёту ў сон, які прыходзіў пасля прачытання некалькіх старонак кніжкі, прыкмеціла я мора. Так блізка, што жаль было не пад'ехаць.

— Едзем далей ці пад'язджаем бліжэй да мора? — спытаў арганізатар нашай паездкі.

— Над мора! — быццам дзеці выгукнулі мы ў адказ.

І пару хвілін пазней шпацыравалі па пляжы, берагам мора. Сонца цягнула ўжо да гарызонту і нам здавалася, што зараз яно патане ў спакойным Балтыйскім моры... Аднак не патанула так хутка. Зблудзіўшы толькі адзін раз у брыдкім, амаль савецкім, зруйнаваным здавалася б па выглядзе гарадку, трапілі мы ўрэшце ў нашу турбазу. А там злёт байкераў. Зразу расхацелася спаць, асабліва калі бліжэй да поўначы было яшчэ відна на панадворку, а ў галоўным будынку чакала разагрэтая саўна.

— Піва ў вас можна купіць? — спыталі мы ў маленькім бары, сарганізаваным адмыслова для святкуючых байкераў.

— А можна ў доларах?

Хутка пералічылі курс, па якім аказалася, што адна банка піва каштаваць нас будзе дзесяць злотых. Наступнага дня чакала нас доўгая дарога ў Петразаводск, але неяк цяжка было адмовіцца ад магчымасці размовы пры піве з мясцовымі матацыклістамі. Такім чынам перагаварылі ўсю ноч. Як аказалася, і з эстонцамі, і з расіянамі. Адны другім запрэзентавалі крыху сваіх песень, мы — нашы падляшскія, яны нам — нейкія песні вікінгаў, каб урэшце супольна гучна праспяваць „Ты ж мэнэ падманула”. Аказваецца, інтэрнацыянальную песню Савецкага Саюза, бо як інакш патлумачыць веданне песні эстонцамі.

У дарозе адаспацца амаль было немагчыма. Мікрааўтобус з самой раніцы хацеў папсавацца, але мы папрасілі ў яго цярплівасці да мясцовага паліва і ён ужо спакойна завёз нас на эстонска-расійскую мяжу. З моста паглядзелі мы абарончыя замкі Нарвы і Івангорада, даволі хутка адправіліся і паехалі... на рынак шукаць абменніка валюты.

— Па колькі ў вас долар?

— Многа гэтых долараў?

— Многа, але скажыце па колькі?

— Я зараз пракансультую.

І наш мабільны пункт абмену валюты пачаў тэлефанаваць да невядомага кансультанта.

— Я хіба хачу ў нармальны пункт, — сказаў нехта ад нас. — Каму ён тэлефануе?!

Неўзабаве падышоў чалавек з другога боку сувязі і супольна прадставілі атракцыйны курс. Памянялі грошы, нехта купіў яшчэ сонечныя акуляры, згубіліся і знайшліся вадзіцелі, урэшце выехалі. Перад намі дарога ў Санкт-Пецярбург. Хаця дарога гэта можа замнога сказана. Гэта хутчэй было хаджэнне па пакутах, так сама як і пазнейшы шлях з Піцера ў Петразаводск, сталіцу Карэліі. Так гадкіх, як сказала б мая бабуля, дарог яшчэ раней не бачылі. Каб захаваць зубы, лепш было не заснуць выпадкова з галавой пры акне. А і глядзець праз акно не было чаго: лес, лес, лес і лес. А што за лесам?

(Працяг будзе)

Чыноўніцкае пустаслоўе

З Міхалова ў Шымкі і далей вядзе асфальтавая дарога. У бок гэтай дарогі ў вёску Бахуры таксама пакладзены асфальт. Але на вуліцы ў вёсцы Бахуры надалей ляжыць стары брук, які напэўна помніць цара-бацюшку: адны калдобіны, быццам помнік XIX стагоддзя. Ад гэтай вёскі ў напрамку Семяноўскага вадасховішча вядзе гравейка. Пры ёй размяшчаецца рыбацкае прадпрыемства, якое адлоўлівае і прадае рыбу. Таксама ў напрамку дачных домікаў, якіх тут больш за сотню, таксама цягнецца жвіроўка, якая пралягае праз вёску Буды і далей. Праехаць па гэтай дарозе амаль немагчыма — самыя размытыя дажджамі калдобіны. Дарога здаўна патрабуе новага насцілу.

Міхалоўскія чыноўнікі чамусьці не памятаюць пра свой абавязак пакласці на гэтым адрэзку асфальт. Але жыхары помняць як гэта перад самаўрадавымі выбарамі абяцалі ім адрамантаваць дарогу, завяралі, б'ючыся кулаком у грудзі, што стрымаюць слова. Аднак аказалася, што было гэта толькі чыноўніцкае пустаслоўе — балбатня, гаварыльня і нічога больш.

Шаноўныя майстры пустаслоўя, адкажыце ўсім тым, хто карыстаецца гэтай дарогай, калі будзе пакладзены асфальт? **Д. Д.**

З Чаромхаўскай гміны

Няма паратунку

Сустрэў я ў Чаромсе на рыначку Алёшу Ваўранюка — солтыса Апакі.

— Ды як там на мяжы жывецца? — пытаю сябра, а гэты з усмешкай кажа: — *Cicho wszędzie, głucho wszędzie...*, — і ўсур'ёз прыбаўляе: — Са звярынай праблема. Ад аленяў і дзікоў не адгонішся. Бульбу нішчаць. На сенажаці ці ў жыце шкоды не зробяць, а бульбу так зрыюць, быццам бы бульбакапалкай прайшоў.

— Нельга нахабнікаў перапалохаць?

— Аднаго можна пастрашыць, але чараду... Як дзесяць-пятнаццаць дзікоў на палетак зваліцца, дык можна ўявіць, які след па сабе пакінуць. Зараз рашыліся мы поле з бульбай абгароджваць, — заяўляе прыяцель. — Ці вырашым праблему? Цяжка прадбачыць.

Вось табе і на!.. Калі сусед табе шкоду зробіць, дык да судовай адказнасці можна яго прыцягнуць, але звярыну ў суд не падасі. Паляўнічыя гурткі страт не кампенсуюць, бо не маюць на гэта сродкаў. Ды і самаўрадавыя ўстановы глядзяць на гэта прыплюшчаным вокам. І як тут разабрацца ў рыначнай капусце?..

Кветачны бег

30 траўня была арганізавана эстафета „Кветачны бег", прысвечаная першай пілігрымцы Яна Паўла II у свабодную Айчыну. У мерапрыемстве ўдзельнічала 56 гімназістаў і функцыянераў Гранічнай аховы. Некаторыя з іх удзельнічалі чацвёрты раз, бо сёлетняя эстафета лічыцца шостым цыклічным аднаўленнем мерапрыемства.

Эстафету ад гміны Нурэц-Станцыя пераняла сакратар Чаромхаўскай гміны Марыя Іванюк на мяжы гмін у Янцэвічах, а перадала гміне Кляшчэлі ў Белай Стражы. Маршрут бегу праходзіў шляхам прыгранічных вёсак на дыстанцыі 23,2 км. Арганізатарам мерапрыемства была Гмінная ўправа. **Уладзімір СІДАРУК**

Хто заараў „Калыску" ў Гацьках?

„Калыска" — так выглядала 16 лістапада 2008 года ... а так — 28 красавіка 2009 г.

Маляўнічы ландшафт у Гацьках каля Бельска многія гады даследавалі археолагі з Польскай акадэміі навук. Навуковыя доследы выявілі, што тут захаваўся надзвычай цэнны, многавяковы ды шматкультурны комплекс старажытнага пасялення. У ліпені 1997 года ў Гміннай управе ў Бельску адбылося ўрачыстае падвядзенне вынікаў археалагічных прац у Гацьках на працягу трыццаці гадоў і адкрыццё экспазіцыі знаходак. У тым самым годзе ў рэестр археалагічных помнікаў Падляшскага ваяводства занесена некалькі дзесяткаў гектараў абшару шматкультурнага пасялення вакол гарадзішча „Замок". Прафесар Збігнеў Кабылінскі з Інстытута археалогіі і этналогіі ПАН у Варшаве патрэбу зберагчы надзвычай цэнны помнік даўніны ў Гацьках аргументуе наступным чынам:

„Цэннасць археалагічнага комплексу ў Гацьках выяўляецца:

— месцазнаходжаннем у ландшафце з выразнымі формамі рэльефу і з уласнай гісторыяй,

— шматкультурнай біяграфіяй ды некалькімі перыядамі пасялення людзей ад старажытнасці да ранняга сярэднявечча,

— разнавіднасцю выкарыстоўвання гэтага месца (абарончае гарадзішча, старажытнае свяцілішча, вытворчасць розных прадметаў), у многіх аспектах не выяўленых у іншых старажытных пасяленнях на тэрыторыі Польшчы,

— самабытнасцю археалагічных знаходак падчас даследаванняў,

— навукова-інфармацыйнай цэннасцю ў тым, што ёсць магчымасць даследаваць этнагенезіс славян".

Яшчэ ў ліпені 1997 года падчас згаданай сустрэчы ў Гміннай управе прайшло талковае абмеркаванне археолагамі, гміннымі чынамі ды працаўнікамі музея ў Бельску спосабаў зберажэння, добраўпарадкавання ды выкарыстоўвання археалагічнага комплексу ў Гацьках. І вось дванаццаць гадоў пазней Раённы суд у Бельску-Падляшскім 3 чэрвеня г.г. на пасяджэнні па справе знішчэння археалагічнага помніка ў Гацьках віноўным прызнаў Гжэгажа Лучая, гаспадара з вёскі Варпэхы-Старэ ў гміне Вышкі. На лаве падсудных апынуўся чалавек, які ў 1999 годзе ўзяў з дзяржаўнай маёмасці ў арэнду больш сямідзесяці гектараў угоддзяў на абшары вёскі Гацькі, якія раней апрацоўваў сельскагаспадарчы камбінат. Мясцовыя гаспадары, якія хацелі арандаваць тыя гектары, пра новага карыстальніка даведаліся пасля таго, як той пачаў наводзіць свае парадкі, але не асмеліліся яны „адваёўваць" зямлю, якая да часу камасацыі сельскагаспадарчых угоддзяў была ўласнасцю іх бацькоў. Гаспадара з гміны Вышкі за арандаваныя ў Гацьках добраўпарадкаваныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі хвалілі не раз чыноўнікі Бельскай гміны. У пачатку лістапада мінулага года Гжэгаж Лучай, як „добры гаспадар", на абшары археалагічнага комплексу заараў больш дзесяці гектараў сенажаці. Абурыла гэта некаторых жыхароў Гацькоў, што „Калыску" (так спрадвеку мясцовыя людзі называюць маляўнічую лагчыну, у якой заўсёды была паша) заараў чужы чалавек. З такой праблемай звярнуліся ў Таварыства „Гай", якое ад дзесяці гадоў хадайнічае за добраўпарадкаванне археалагічнага комплексу. Спасылаючыся на Закон аб ахове помнікаў даўніны, трэба было звярнуцца ў пракуратуру з паведамленнем аб падазрэнні ў знішчэнні помніка мінуўшчыны. Пасля некалькіх месяцаў следчага працэсу справа трапіла ў суд. За гэты час арандатар на заараных гектарах пасеяў пшаніцу і чакае добрага ўраджаю, а да таго — пабольшаных „эўрадаплат". Спадар Гжэгаж Лучай прызнаны судом віноўнікам знішчэння помніка даўніны і аштрафаваны на агульную суму каля пяці тысяч злотых. Аднак надалей нявырашанай застаецца праблема зберажэння ды добраўпарадкавання ўнікальнага археалагічнага комплексу ў Гацьках.

У дзяржаўным законе аб ахове помнікаў дакладна напісана, што ахова помнікаў заключаецца на захадах адміністрацыйных органаў дзеля стварэння юрыдычных, арганізацыйных і фінансавых умоў для зберажэння, добраўпарадкавання ды захавання іх, а таксама прадухілення магчымых пагроз, якія могуць знізіць каштоўнасць помніка. Закон на паперы, а жыццё ідзе сваім ходам. Адміністрацыйных органаў у нас мноства, нават цяжка разабрацца чым яны займаюцца і хто за што адказны. Найпрасцей пакараць чалавека, які не ў змозе зразумець у чым ён вінаваты. Няхай другія баяцца!

Тэкст і фота Яна МОРДАНЯ

Такая гісторыя

Якраз перад Днём перамогі пахавалі ў Трасцянцы незамужнюю жанчыну 1943 года нараджэння, якая называлася Ніна Кобзеў, а звалі яе тут проста Кобзя. Гісторыя яе і яе сям'і жудасная і я падумала, што варта яе апісаць з таго, што яшчэ людзі памятаюць.

Трэба сягнуць яшчэ да канца XIX стагоддзя, калі дзед памерлай Ніны, Андрэй Петручук родам з Трасцянкі, працаваў за царскім часам на жалезнай дарозе. Часта ездзіў праз Варшаву, дзе пазнаў маладую прыгожую жыдовачку Ялену, якую звалі проста Лёля. Яна згадзілася з-за кахання ўцячы ад бацькоў і павянчацца ў царкве. Калі Андрэй з Лёляй дабраліся да Трасцянкі, неўзабаве з'явіўся тут жыдоўскі кагал. На шчасце, ніхто не выдаў дзе схаваліся маладыя, а потым, пасля шлюбу, было позна.

У маладой пары паявіліся зараз дзеці, але ніхто толкам не ведае, хто быў найстарэйшы, мабыць, Вера. Потым — Надзя, Соня, Валодзя і Шура. Бацька зарабляў, Лёля гадавала дзяцей, аж пачалася І сусветная вайна і бежанства. З таго бежанства сям'я вярнулася цэлая і тут гаспадарылі. Дзяўчаты служылі, павыходзілі замуж, пажаніліся, толькі Вера і Надзя да вайны былі незамужнія. І якраз Надзя зацяжарыла з нейкім саветам, што хаваўся ў Трасцянцы. У яго было прозвішча Кобзеў. Куды ён потым падзеўся, ніхто толкам не ведае. А ўсе дзеці Андрэя і Лёлі трапілі ў канцлагер як дзеці жыдоўкі ў першым пакаленні. Калі немцы вывозілі іх, малую Надзіну дачушку Ніну адабралі ў маці і кінулі хрышчонаму бацьку, мясцоваму беларусу Мікалаю Філіпюку. І так малая гадавалася з 1943 года па 1946 год у хрышчонага. У гэтым годзе вярнулася з канцлагера цётка Ніны, Вера. А ўсе іншыя Лёліны сыны і дочкі загінулі ў Асвенціме. Сама Лёля халавалася была ад немцаў у Нараўцы, дзе яе ўбачыў немец і застрэліў. Яе мужа Андрэя ўжо да вайны не было ў жывых.

І вось цётка Вера занялася пляменніцай і гаспадаркай па сваіх бацьках. Ніна падрасла, скончыла мясцовую пачатковую школу, потым беларускі ліцэй у Бельску. Вучылася яшчэ і далей, а потым працавала ў бюро ГСу ў Нарве, а потым тут у Трасцянцы ў бюро калгаса. І прыйшла такая хвіліна, што здарылася з ёю няшчасце. Яна так зачадзела, што невядома было, ці з таго выйдзе. Але было на жыццё, хоць доўга ляжала ў бальніцы ў Беластоку. Гэта было ў васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя. І Ніна дастала рэнту. Памаленьку рабіла дома. Колькі помню, яна заўсёды гадавала курэй і гусей і корпалася ў агародчыку, які памагаў ёй рабіць Барыс, мясцовы старэйшы кавалер. Ён там прыжыўся і ва ўсім памагаў Нінцы. Але па яе смерці знайшліся сваякі, якія (як кажуць хлопцы ў мясцовым *склепе*) Барыса „эксмітавалі", а ў хаце змянілі замкі. Во, якая гісторыя!

РУТА

Радасны дзень Арлянскага прыхода

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Сёлета 21 мая выпала двайное свята ў Арлянскім прыходзе: прыхадское свята ў гонар св. Іаана Багаслова і юбілей 80-годдзя настаяцеля Свята-Міхайлаўскай царквы а. мітрата Аляксандра Такарэўскага. Юбіляр нарадзіўся 28 красавіка 1929 года ў Корніцы Люблінскага ваяводства; у Орлі служыць з 1962 года, святаром агулам праслужыў 59 гадоў. Прыхаджане з нецярплівасцю чакалі юбілею свайго настаяцеля, дапытваліся пра тэрмін.

У гэты дзень нават неба было незвычайнае — хмары расступіліся, павеяў ветрык і веснавыя ранак з поўднем нагадвалі летнюю пару. З пазелянелых дрэў ліліся радасныя галасы птушак. Радасць ахапіла цэлы прыход. Прыцаркоўная стаянка запоўнілася самаходамі, трактарамі, а царкоўны пляц — дзесяткамі а мо і сотнямі веласіпедаў. Побач парку паставілі свае ларкі кандытары. Побач званіцы стаў вялікі кіёск з культавым таварам, які абслугоўвалі прадаўцы з-за ўсходняй мяжы. У гэты дзень школьныя заняткі былі скарочаны. Немалая Свята-Міхайлаўская царква не памесціла ўсіх прыхаджан ды гасцей і многім вернікам давялося аставацца звонку храма, шчыльна запаўняючы прыцаркоўны пляц.

З раніцы прыход наведаў епіскап сямятыцкі Георгій, які ўзначаліў Святую Літургію. Перад уваходам у храм уладыку віталі дзеці, моладзь, прадстаўнікі мясцовых улад, братчыкі, духавенства і шматлікія вернікі.

Пасля хрэснага шэсця, калі хор праспяваў „Многая лета", уладыка Георгій сказаў пропаведзь, у якой прыгадаў асобу Іаана Багаслова і ягоныя навукі. Хто не мае ў сабе любві, таго нельга лічыць хрысціянінам, нават калі ён будзе многа часу праводзіць у царкве. Бо любоў, гэта дзверы, якія вядуць у рай, і зараз задача хрысціян заключаецца ў прапаведаванні любві, як гэта рабіў Іаан Багаслоў. Уладыка Георгій ад імя мітрапаліта Савы перадаў юбіляру словы прызнання і падзякі. І са свайго боку епіскап Георгій даў высокую ацэнку юбіляру і павіншаваў яго. Перадаў ён таксама а. Такарэўскаму ікону ад уладыкі Савы.

Уладыка Георгій узнагародзіў асабліва заслужаных прыхаджан. Ордэнам св. Марыі Магдаліны III ступені была ўзнагароджана Зінаіда Дзенісюк, а пахвальнымі лістамі — Галіна Банькоўская, Марыя Багацэвіч і Лідзія Цэтра. Епіскап падзякаваў таксама духавенству, арлянскаму і калінінградскаму царкоўным харам, моладзі, дзецям, царкоўнаму старасту і ўсім прыхаджанам. Дзякаваў таксама сам а. Аляксандр Такарэўскі.

Многія прыхаджане з нецярплівасцю чакалі моманту асабістага віншавання свайго настаяцеля. А віншавалі яго прысутныя святары, дэлегацыя ад Гміннай управы з войтам Пятром Сэльвесюком, сакратаром Ірэнай Адзіевіч ды старшынёй Гміннай рады Аляксандрам Клінам, дырэктар школы Дарыюш Гарадэцкі, намеснік прэзідэнта Беластока Аляксандр Сасна, кандыдат у еўрапарламентарыі Антон Мірановіч (ягоныя выбарчыя плакаты віселі на агароджы вакол царквы) ды шматлікія вернікі.

Царкоўны стараста Анатоль Мартыновіч, віншуючы юбіляра, падкрэсліў агромны ўклад працы настаяцеля ў карысць Арлянскага прыхода і падзякаваў яму за малітву і пашану для прыхаджан. Ад іх імя падарыў ён а. Такарэўскаму ікону ягонага цёзкі Аляксандра Неўскага і пажадаў яму здароўя на многія гады; хор праспяваў „Многая лета". Ад прыхаджан юбіляр атрымаў таксама букет з васьмідзесяці чырвоных руж. Ад гмінных улад настаяцель атрымаў, поруч з букетам, зашклёную графіку арлянскай царквы аўтарства Уладзіслава Петрука. Павел Грайко з Пашкоўшчыны склаў адмысловы вершаваны віншавальны адрас юбіляру. Усе прысутныя былі сэрцам са сваім настаяцелем, але асабліва цешыла прысутнасць моладзі і дзяцей; радасна было паглядзець, як яны з адной кветкай у руках віншавалі юбіляра.

Юбілей а. Аляксандра Такарэўскага і прыхадское свята былі вельмі ўрачыстай падзеяй для ўсяго Арлянскага прыхода. Вернікі разыходзіліся дамоў адухоўленымі, радыя добрай кандыцыі свайго настаяцеля. Суправаджаў іх, аднак, і нейкі сум, задума над праміннанем і нейкая трывога за будучыню Арлянскага прыхода і прадчуванне, што ў будучыні ніхто не дасягне раўні а. Аляксандру Такарэўскаму. Бо настаяцель ніколі нікога не пакрыўдзіў, нават словам, а на ягоным твары заўсёды ціхамірнасць, усмешка і сардэчнасць. Гэтак на практыцы святар нясе апостальскія словы: „Любіце сябе ўзаемна, а будзе гэта адзнакай, што любім Бога". Многая лета, Вам, дарагі юбіляр.

Многія вернікі і духавенства ў час богаслужэння

Ад прыхаджан юбіляр атрымаў букет з васьмідзесяці чырвоных руж

Павел Грайко павіншаваў юбіляра вершам

Прадаўшчыца...

Хоць Марыя Семянюк з Трасцянкі на пенсіі ўжо больш як 20 гадоў, усе яе тут добра ведаюць. Папастаяла тут за прылаўкам ГСаўскай крамы і мусіла ўсім дагадзіць з 1950 па 1986 год. А яшчэ раней пачала працу прадаўшчыцы ў сваёй роднай вёсцы Кленіках і год у Тыневічах. Так што стаж працы за прылаўкам у яе неблагі — 38 гадоў!

Нарадзілася спадарыня Марыя ў вялікай вёсцы Кленікі (тады яшчэ Нарваўскай гміны) у лютым 1928 года ў сям'і Ніканора і Анастасіі Паплаўскіх. Сястра Ксеня была ад яе на 4 гады старэйшая. У дзіцячым узросце дзяўчынкі асталіся без бацькі. І зведалі цяжкую працу на гаспадарцы ў перадваенны час. Бацька адышоў у 1932 г. і дзяўчаткі, ходзячы ў польскую школу, памагалі маме ў меру сваіх сіл. Пры саветах сёстры хадзілі на вечаровыя курсы і далей дапамагалі маме ў гаспадарцы. Пры нямецкай уладзе старэйшая сястра хутка трапіла на прымусовыя работы, а Маруся перажывала тут усе страхі вайны. Найгорш было ў фронт, у ліпені 1944 года. Згарэла іхняя хата і ўвесь дабытак. На шчасце хутка вярнулася з Германіі сястра Ксеня і выйшла замуж на калёнію.

— Зяць мае мамы пабудаваў неўзабаве хату на нашым пляцы і мама са мною мелі ўжо свой дах над галавою. Неўзабаве — у 1948 годзе — я стала на працу ў ГС у сваёй вёсцы, потым у Тыневічах, а ў 1950 годзе перавялі мяне ў далёкую ад маіх Кленік Трасцянку. І стала я тут прадаваць ГСаўскія тавары ў старой краме пры бялоцкай дарозе. У пачатку шасцідзесятых гадоў у вёсцы пабудавалі новую краму, дзе я працавала аж да пенсіі — да 1986 года. Тут я ў 1953 годзе выйшла замуж за Віктара Семенюка і стала жыць у іхняй мураванцы побач школы. У нас нарадзілася трое дзяцей: Валодзя ў 1954 г., Люся ў 1958 г. і наймалодшая Лена ў 1967 г. Я ўвесь час працавала ў лаўцы, муж займаўся гаспадаркай, а дзяцей памагала даглядаць нам мая свякруха. І так мы ўсе гаравалі. Дзеці неўзабаве паканчалі падставовую школу, сярэднюю і вышэйшыя навукі ў блізкім Беластоку. Там яны і асталіся жыць, абзавяліся сем'ямі, працуюць. Сын Валодзя — выкладчык, ён займаецца са студэнтамі. Дачка Люся працуе ў нейкай фірме, а другая — Лена — архітэктар. Ад дзяцей я дачакалася 6 унукаў: 4 хлопчыкаў і 2 дзяўчынак. Часта сюды прыязджаюць наведаць бабулю са сваімі бацькамі...

Маруся Семянюк з унучкам Хрыстафорам, якому цяпер 16 гадоў

Цяпер Маруся, бо так яе ў Трасцянцы заўсёды звалі, жыве адна. Муж Віктар памёр два гады таму.

Яна любіць пагутарыць з людзьмі, седзячы з суседкамі на лавачцы ў добрую летнюю пагоду, і заўсёды ўсміхаецца. І хоць здароўя даўно няма, выходзіць на сваіх хворых нагах да людзей і ў царкву ў свята, бо блізка ад яе ўжо роднай хаты.

РУТА

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Сонечны пансіянат „Бора-Здруй”

Усе мы любім летнікі, экскурсіі, супольныя вандроўкі. Удзельнікі XXIII Сустрэч „Зоркі” — вучні з Беластока, Гарадка, Гайнаўкі, Бельска ды іншых мясцін Беласточчыны — мелі нагоду сустрэцца ў прыгожым пансіянаце „Бора-Здруй” у Новым Ляўкове. Сабралася нас разам семнаццаць вучняў — прыхільнікаў беларускай мовы, чытачоў „Зоркі”. Лічу вялікім гонарам папасці на Сустрэчы „Зоркі”. Многія з нас, у тым ліку і я, на Сустрэчах „Зоркі” ўпершыню. Праца ў рэдакцыях, хоць не заўсёды лёгкая, дае нам многа задавальнення. Мы можам навучыцца ствараць інфармацыі, рэцэнзіі, інтэрв’ю і фельетоны. Удзельнікі падзяліліся на дзве групы, з якіх узніклі дзве рэдакцыі: „Аранжавая хатка” і „Павуцінне”. Мы цешыліся таксама смачнай кухняй і многімі гульнямі, якія прыдумалі нам гаспадары пансіяната: Людміла і Барыс Казлоўскія. Тут можна нават паглядзець як жылі і працавалі нашы продкі. Сустрэчы „Зоркі” праходзілі з 5 да 10 чэрвеня г.г.

Габрыеля Юлія Налівайка — „Аранжавая хатка” (V клас ПШ у Гарадку)

Фота Ганны Кандрацюк

З госцем Камілем Сіповічам (у капелюшы) стаяць у першым радзе злева: Ілона Карпюк, Юстына Тамашук, Аня Келбашэўская, Міхась Сцепанюк (сядзіць), Юстына Якімюк, Оля Міранюк, Эля Коршак, Наталька Кандрацюк-Свярубская. У другім радзе злева: Аня Ярымовіч, Наталька Семянюк, Оля Сіманюк, Габрыся Налівайка, Уля Ліпато, Магда Леанюк, Лукаш Зіневіч, Валя Бабулевіч. У трэцім радзе злева: Куба Мэтэнька, Тамаш Ляшкевіч.

Жыццё як песня,заўсёды канчаецца...

Фота Ганны Кандрацюк

Крыначка: Рэжысёр Пётр Бароўскі знаёміцца з сямейкай сяброўкі Сустрэч - Эвы Мароз-Кэчынскай

Загаловак фільма: „Канец песні”
Пастаноўка: Пётр Бароўскі
Сцэнарый: Пётр Бароўскі
Героі: Жыхары вёсак Сакольшчыны

Пётр Бароўскі — поўны пазітыўнай энергіі і ўражлівасці чалавек. Сваім фільмам „Канец песні” ён звяртае ўвагу на крыўду людзей, якія страцілі блізкіх асоб. Каб перайсці далей, трэба ведаць генезіс фільма. Рэжысёр калісьці вандраваў па падсакольскіх вёсках, дзе людзі спявалі яму свае песні. Другі раз ён наведаў гэтыя мясціны 27 гадоў пазней. Большасці яго спевакоў ужо не было ў жывых. І так паўстала думка зрабіць фільм. Галоўны сюжэт — успаміны пра блізкіх людзей і мінулае вёскі. Фільм выціскае слёзы не толькі ў герояў, але і ў многіх гледачоў. Дакумент пра ўміранне даволі жорсткі, але без такіх эмоцый нельга апісаць смерць. Сцэнарый пераплятаецца з музыкай, якая закранае душу. Музыка гэта не толькі фон фільма, яна будуе дзеянне і мацуе экспрэсію. На маю думку, гэты фільм паказаў, што Пётр Бароўскі — знакавая асоба XXI стагоддзя. Фільм рэкамендую ўсім, хто мае сентымент для сваёй гісторыі, шануе памяць продкаў, і тым людзям, у якіх уражлівая душа і якія ўмеюць спачуваць іншым.

„Павуцінне” — Лукаш Зіневіч (II клас гімназіі ў Гарадку)

Свяцілі магілы і ездзілі на Крыначку

Дзень да Тройцы, у бацькоўскую суботу, мы пайшлі на могілкі ў Ляўкове. Знаёмства з месцам пачалі ад часткі новых могілак. Тут сустрэлі спадарыню Ніну (з роду Бандарук), якая прыбірала магілы сваіх бацькоў і сястры. Ад яе мы даведаліся, што свята Тройцы ў парафіі называюць Клечанне або Зелянец. На другі дзень сям’я нашай субяседніцы заўсёды ездзіла на Крыначку. Гэтае святое месца з цудоўнай крыніцай знаходзіцца ў Белавежскай пушчы, 18 кіламетраў ад Ляўкова. Раней людзі ездзілі фурманкамі, цэлымі сем’ямі.

Магілы асвячаюць дзень пасля Тройцы, у г.зв. Градавую сераду.

— У гэты дзень мы не працуем у полі, — кажа пані Ніна.

Чаму? Адказ прыносіць народная прымаўка: *У Градавую не можна ў полі рабіць, бо будзе град валіць!*

Пасля мы пайшлі на старыя могілкі. Тут пазнаёміліся з Алінай і Аляксандрам Харкевічамі з Засцянак, што каля Беластока.

Спадар Аляксандр сказаў, што яму вельмі баліць душа, калі чуе, як мясцовыя людзі размаўляюць на могілках па-польску. Спадарству Харкевічам больш падабаліся старыя могілкі, а ў нас на гэтую справу погляды падзелены.

„Павуцінне” — Магдалена Панасюк (I клас белгімназіі ў Гайнаўцы) і Уля Ліпато (V клас ПШ у Аўгустове)

Фота Ганны Кандрацюк

На старых могілках у Ляўкове, спадарства Аліна і Аляксандр Харкевічы з сустрэчнікамі: Магдай Леанюк, Уляй Ліпато, Наталькай Семянюк, Каролем Лукшой

Хіпі любілі людзей!

Інтэрв'ю з Камілем Сіповічам — філосафам, паэтам, музычным выдаўцом, аўтарам кнігі „Хіпі ў ПНР".

„Аранжавая хатка": — *Колькі Вам было гадоў, калі Вы прыступілі да руху хіпі? І чаму якраз Вы захапіліся гэтай контркультурай?*

Каміль Сіповіч: — Мне было семнаццаць гадоў. Аднойчы я ўбачыў іх на Старым горадзе ў Варшаве. Мяне паразіла гэтая карціна, я першы раз пабачыў, што ў камуністычнай краіне людзі мелі свой свабодалюбівы стыль: доўгія валасы, хіпі-музыку, каляровую вопратку...

— *Які ўплыў на Вашу адукацыю мела сувязь з рухам хіпі?*

— Мы вучыліся дзеля прыемнасці, адначасова хацелі ствараць сваю мікраграмадскасць. Дзякуючы руху хіпі, я дайшоў да сваіх сапраўдных зацікаўленняў. Я закончыў філасофію ў Тэалагічнай каталіцкай акадэміі.

— *Чым Вы займаліся ў руху хіпі?*

— Я нічым не займаўся, таму што гэта быў рух лянівых людзей (*смех!*).

— *Наколькі ідэалы хіпі мелі ўплыў на Ваша жыццё?*

— Усё зводзілася да адной справы: хіпі любілі людзей. Мы стараліся наладзіць між сабой жыццё ў гармоніі з прыродай. Мы звярталі ўвагу на здаровую ежу. Пачалі насіць адметную, прыгожую вопратку... І таксама стараліся быць талерантнымі для іншых рас, рэлігій і сексуальных арыентацый.

— *Ці польскі рух хіпі адрозніваўся ад таго ў ЗША?*

— Наш рух пачаўся сам па сябе ў 1967 годзе. Мы не ведалі, што падобная з'ява адбываецца ў Амерыцы. Пра тое, што такі рух узнік у ЗША і скалыхнуў Амерыкай, мы даведаліся пазней, з прэсы. Ведаю, што рух хіпі існаваў у Беларусі, моцны цэнтр якога знаходзіўся, напрыклад, у Гародні. Калі справа ў адрозненнях, дык у Польшчы рух хіпі дзейнічаў на абочыне грамадскага жыцця, нас прыніжалі, праследавалі міліцыя і бяспека. Яны бачылі пагрозу ў індывідуальнасці, у адкрыцці на іншых. Вядома, мы адрозніваліся ад хіпі ў ЗША. У Амерыцы з'яву хутка скарысталі ў камерцыі, сталі зарабляць на хіпі. Бізнесоўцы пачалі выпускаць машыны для хіпі, прадукавалі каляровую вопратку і аздобы, арганізавалі экскурсіі ў Непал або Індыю. Польскія хіпі нешта пераняллі з Захаду, але можна сказаць, што мы самі стварылі сваю адметнасць.

— *Як бацькі ўспрымалі Вашу прыналежнасць да руху хіпі?*

— Мой беларускі бацька меў другую сям'ю і мной не займаўся. А маці, вядома, была спалоханая.

— *Часта думаем, што хіпі адказныя за распаўсюджванне наркотыкаў. Ці сапраўды Вы пачалі хвалю наркаманіі?*

— Добрае пытанне! Скажу так. Усе грамадствы мелі свае наркотыкі. Гарэлка гэта таксама наркотык. Хіпі прыдумалі свой уласны спосаб, каб „адкрыцца" на свет цераз наркотыкі. Магу аднак сказаць, што мы часткова адказныя за развіццё наркаманіі. Я сам ніколі не быў залежным ад іх, але мой сын меў такія праблемы і мы былі вымушаны аддаць яго на лячэнне.

— *Па лініі бацькі Вы — пляменнік беларускага біскупа Чэслава Сіповіча. Якое значэнне маюць для Вас беларускія карані?*

— Яны важныя ў маім жыцці. У маіх жылах плыве беларуская кроў майго бацькі, з якім я ніколі не пазнаёміўся. Аднак у апошні час я зацікавіўся гісторыяй маёй сям'і. Часта бываю на Беласточчыне, дзе маю сяброў. Вельмі люблю размаўляць з Сакратам Яновічам. Хачу паехаць на Браслаўшчыну ў Беларусь і там пашукаць сваіх каранёў.

— *Амаль ва ўсіх гандлёвых галерэях на надыходзячы летні сезон прапануюць каляровую моду хіпі. Як Вы ўспрымаеце такі паварот?*

— Мода хіпі вельмі прыгожая. Яна ўвяла джынсы, разнаколерныя строі ў мексіканскія, індзейскія, індускія ўзоры, усякія арыентальныя аздобы. Але не адна мода вяртаецца. Пасля гадоў, 12 чэрвеня вяртаецца ў кіно культавы фільм Мілаша Формана „Hair". Мяне, дарэчы, папрасілі выказацца пра гэты фільм для газеты „Dziennik" (інтрэв'ю паказалася ва ўчарашнім нумары). Там, між іншым, я гавару як нашы хіпі ездзілі ў Будапешт паглядзець гэты фільм, бо ў Польшчы яго доўга яшчэ не пускалі...

PS. *Размову мы правялі 7 чэрвеня г.г. у Новым Ляўкове.*

Гутарку-інтэрв'ю пад кірункам Ганны Кандрацюк і Ілоны Карпюк падрыхтавала рэдакцыя „Аранжавай хаткі" (Наталля Кандрацюк-Свярубская, Наталля Семянюк, Эля Коршак, Міхаліна Герасімюк, Юстына Якімюк, Тамаш Ляшкевіч, Кароль Лукша, Габрыеля Налівайка). Некаторыя пытанні выйшлі ад сустрачанскай публікі. Размову апрацавалі: Эля Коршак (III клас белгімназіі ў Бельску-Падляшскім) і Міхаліна Герасімюк (I клас белгімназіі ў Гайнаўцы)

Фота Тамаша Ляшкевіча

Каміль Сіповіч: *Нарадзіўся ў 1953 г. у Атвоцку. У 1970 г. ангажаваўся ў рух хіпі. Прымаў удзел у контркультурных хэпенінгах Анджэя Зузака ў варшаўскім клубе „Сігма". Закончыў філасофію на Каталіцкай тэалагічнай акадэміі. Філасофскія студыі ў Варшаве, Мюнхене і Заходнім Берліне падвёў у кніжным выданні „Heidegger: Degeneracja i nieautentyczność" (2005). У канцы 2008 г. выходзіць сацыялагічны нарыс пра рух хіпі ў Польшчы „Hipisi w PRL-u". З 1975 г. супрацоўнічае з музычным журналам „Jazz", засноўвае музычнае выдавецтва. Як паэт дэбютуе ў 1983 г. (друкуецца ў часопісе „Twórczość"). Аўтар паэтычных зборнікаў: „Tajemnicze dzieje pierwiastków", „Świder metafizyczny", „I znowu pogrzeb we wrześniu", „Pieśni solarne".*
З 1975 г. сяброўкай яго жыцця з'яўляецца зорка польскай рок- сцэны Кора, з якой напісаў кніжку „Podwójna linia życia". ***(гак)***

Каміль Сіповіч

Кажуць, што я страціў голас

Мне казалі: ты падобны
на памерлых нашых хлопцаў.
дзве старэнькія суседкі —
што памерлі ўжо даўно —
Ты, казалі, страціў голас,
зрок і мову.
Ведаў я:
не належаць яны мне.
Падобна і памяць
не хоча каб яе запамятвалі.
Можа, холад гэта хтосьці,
хто ў мне жыхар пастаянны?
Мо такое падабенства
— існавання майго сэнс —
бо ж казалі: ты падобны
на памерлых нашых хлопцаў?

Пераклала Міра ЛУКША



У падарку ад Коры і Каміля сустрэчнікі атрымалі здымкі з аўтографам, кашулькі з выявай гурту „Манам", CD і DVD з музыкай Коры. Паколькі 8 чэрвеня Кора святкавала дзень нараджэння, мы праспявалі ёй „Многая лета" і „Купалінку". Нашым сябрам мы падарылі „Жоўтую музыку" Надзеі Артымовіч і CD з праваслаўнай літургіяй кампазітаркі Лэсіі Дзічко. Аказалася, што амаль усе сустрэчнікі спяваюць у царкоўных харах. І вядома, з'елі за іх торт. Дзень нараджэння разам адзначалі Ілона Карпюк і Пётр Бароўскі

Патрыятызм прыемны беларусу

Размова са Зміцерам Сасноўскім — лідарам гурту „Стары Ольса”

„Ніва”: — *Чым з’яўляецца музыка Вялікага Княства Літоўскага?*

Зміцер Сасноўскі: — Гэта сукупнасць музыкі ўсіх пластоў грамадства ВКЛ і сукупнасць музыкі розных перыядаў мастацтва. Мы ганарымся, што самыя раннія, дакладна ў нас фіксаваныя, гэта „Абарона Крэчава” (але там недакладныя вызначэнні, бо магло быць гэта напісана з XIII да XVII стагоддзя), і яшчэ першая фіксацыя „Багародзіцы” ў ВКЛ, 1529 г., 1585 г., 1558 г. — розныя кампазіцыі, а потым ужо XVII ст. Такім чынам паняцце музыка ВКЛ для гурту „Стары Ольса” гэта музыка позняга сярэднявечча, XIV-XV стагоддзі, гэта музыка эпохі рэнесансу ў нас — XVI ст., і музыка манерызму і ранняга барока — гэта першая палова XVII ст. Хаця самая позняя кампазіцыя зафіксаваная ў нашым рэпертуары гэта 1686 год — „Будзінская бітва”. Таму набор музыкі розных пластоў насельніцтва — ад сялянскай да шляхецкай, камернай, і гэтых трох перыядаў для нашага гурту з’яўляецца зместам паняцця музыка ВКЛ.

— ***А як у гэтым усім існуе „беларускасць” у музыцы ВКЛ?***

— Беларускасць існуе ў гэтым паняцці ў выглядзе такога нацыянальнага субстрату, нацыянальнай асновы, элемента, які існаваў у ВКЛ у такіх рысах, як дзяржаўная мова, мова дзелавой перапіскі, мова літаратурных твораў, мова музычных, паэтычных твораў. Таму беларускасць, як мы называем „старабеларускасць” ці „ліцьвінскасць”, гэта для нас тое, у якой форме існавала беларуская народнасць у ВКЛ. Гэта сярэднявечная беларуская народнасць, якая вельмі моцна ўплывала на ўсю культуру ВКЛ...

— ***Вы ўспомнілі „Багародзіцу”. Гэта беларуская, ліцьвінская, польская песня? У Польшчы яна з’яўляецца амаль гімнам.***

— Ёсць пытанні. Да канца гэта не даследавана. Усе самыя славутыя даследчыкі пішуць, што, на жаль, невядома дзе і невядома кім напісаны гэты рэлігійны гімн, які ў першых сваіх самых старажытных чатырох слупках мае прыкметы стараславянскасці, а такія даследчыкі як Раман Мазуркевіч заўважылі падабенства гэтых слоў з лексікай і стылістыкай Кірылы Тураўскага. А ўжо далей тое, што было напісана ў XVI і XVII стагоддзях, з’яўляецца на самай справе польскім творам, на польскай мове, і з’яўляецца польскай часткай іменна „Багародзіцы”. Старажытная частка — царкоўнаславянская з украпленнямі старабеларускіх слоў мае прэтэнзіі на тое, што гэтыя першыя слупкі былі напісаны або чалавекам, які перасяліўся з Вялікага Княства Літоўскага ў Польшчу, або пазнаёміўся з каталіцкай гімнатворчасцю, але напісаў прынцыпова візантыйскімі для рэлігійнага гміна традыцыямі. Таму гэтае пытанне прыўзнятае да гэтага часу. Вядома, што яшчэ і Ян Длугаш пісаў, што ў XV стагоддзі гэтая песня была ў Польшчы як *Carmena Patrum* — песня айчыны. А ў нашых даследчыкаў ёсць прэтэнзіі на тое, што гэтая старажытная песня створана на Беларусі, таму што першы зафіксаваны вядомы на сёння беларускі варыянт „Багародзіцы” 1529 года — ён цэльны ад першых чатырох і да трынаццатага слупка. Цэльны і стылістычна, і паэтычна, граматычна, — гэта адна мова. У польскіх чатыры першыя супадаюць з нашымі, а далей гэта чыстая польская мова. Некаторыя даследчыкі пісалі, што гэта мяшанка — польска-царкоўнаславянская. Але „польска-старацаркоўныя” мяшанкі з’яўляюцца не чым іншым чым старабеларускай мовай.

— ***Скажыце мне, калі ласка, чаму Вы сёння, у сучаснай Беларусі, займаецеся такога роду музыкай?***

— Гэта адна з форм патрыятызму, патрыятызму дзейснага, паказнога і публічнага, але які не перасследуецца. Гэта легальная форма вельмі адкрытага і вельмі эмацыйна насычанага патрыятызму. Таму літаральна зараз гэта мае сэнс. Ведаючы гісторыю Беларусі, такая форма патрытыязму мела сэнс заўжды. Гэтак жа і Манюшка свае оперы праз цэнзуру ставіў. Захапленне старажытнасцю ў музыцы ва ўсе часы ў Беларусі было актуальным і дапамагала быць сапраўдным патрыётам, легальна праяўляць свае пачуцці да радзімы.

— ***Што такое патрыятызм у Беларусі?***

— Ідэй патрыятызму ёсць шмат. Я няздольны разважаць пра патрыятызм увогуле. Я лічу, што патрыятызм гэта не служэнне і не абавязак. Патрыятызм гэта зусім наадварот. Я асабіста шмат часу прытрымліваюся тэорыі геданізму ў патрыятызме. Патрыятызм гэта калі ты адчуваеш і маральнае, і нават фізічнае задавальненне ад уласнай культуры. Табе падабаецца свая культура, родная прырода, сваё мастацтва, свая гісторыя, і калі ты ад гэтага ловіш асабістае задавальненне, якое можа быць паралельным і з захапленнем іншай культурай і іншай краінай. Я лічу, што гэта сапраўдны партыятызм. А не той, які патрабуе ад чалавека рабіць тое, што яму абсалютна непрыемна.

— ***А патрыятызм у параўнанні з нацыяналізмам, у добрым сэнсе гэтага слова?***

— Разважаць пра паняцце нацыяналізму я б і не браўся, таму што вельмі вялізны спектр зместаў гэтага паняцця. Людзі могуць пачуць нешта іншае, а гэта небяспечная рэч. Гэта як і разважаць пра нацыянал-сацыялізм. Можна аб ім размаўляць па-рознаму, але як ужо на ім стаіць кляймо, аднойчы ў гісторыі пастаўленае, то разважаць пра яго далей немагчыма. Як і пра свастыку — цудоўны сімвал, які ўсю гісторыю меў насычэнне важкім зместам, ды для сучаснай цывілізацыі і, мабыць, назаўжды ён сапсаваны зместам нацыянал-сацыялізму.

— ***Як Вы думаеце, чаму беларусы так не любяць сваёй беларускасці? Вядома, не гавару пра ўсіх.***

— Я думаю, што беларусы любяць беларускасць. Але ў беларусаў ёсць такая кепская рыса, такі мінус, — вельмі ранімае адчуванне публічнасці. Гэта значыць што тое, што ўваходзіць у моду, становіцца заўсёды маднейшым чым мясцовае. Гэта можна прасачыць з XVI стагоддзя. Афіцыйна ў другой палове XVI стагоддзя ў Беларусі друкавалася больш польскамоўных кніг, чым у самой Польшчы. На першым месцы стаяла раней лацінскамоўная літаратура, а яшчэ раней царкоўнаславянская, пры ўнясенні ў якую мясцовага тварылася старабеларуская... Сармацкі стыль таксама ў нас стаў модным, потым — французская мода, потым — руская... Беларускае — заўсёды яно ў беларусаў захоўваецца, і ў пэўных момантах, і ў пэўнай кампаніі яно праяўляецца вельмі-вельмі актыўна. Дзякуючы таму, што беларусы дзіўны народ, які адчувае сябе заўжды на сцэне, і кожны лічыць, што трэба трымаць нейкую марку, няма як проста быць сабой нават на сцэне. І з-за гэтага ўтвараецца нейкая ненармальная рэч, вельмі прыкрая, як недастатковая ўвага да ўласнай культуры.

— ***Дзякуем за размову і музыку.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

„Стары Ольса” — гурт сярэднявечнай беларускай музыкі, існуе з 1999 года, стваральнік і кіраўнік — Зміцер Сасноўскі. Склад — 6 асоб. Назва — ад ручая ў заходняй Магілёўшчыне. У рэпертуары — беларускія народныя балады і ваярскія песні, творы беларускіх кампазітараў эпохі рэнесансу, кампазіцыі беларускіх зборнікаў прыдворнай музыкі („Полацкі сшытак”, „Віленскі сшытак”), беларускія канты XVI — пачатку XVII стагоддзяў, а таксама еўрапейскія папулярныя мелодыі эпохі сярэднявечча і рэнесансу. Гурт супрацоўнічае з рыцарскімі клубамі, музеямі, даследчыцкімі цэнтрамі, майстрамі старадаўніх інструментаў, з гуртамі старадаўняй музыкі і асобнымі выканаўцамі на старых інструментах. Музыка гурту дазваляе аднавіць гучанне многіх забытых інструментаў. Для выканання выкарыстоўваюцца максімальна магчымыя копіі (па выглядзе, тэхналогіі і сыравіне) даўніх беларускіх інструментаў — дуды, валынкі, ліры, гусляў, свірэлі, варгана, акарыны, сурмы, берасцяной трубы, гудка, барабана. Часта спалучаецца гучанне старажытных беларускіх і агульнаеўрапейскіх сярэднявечных інструментаў — лютняў, рэбека, флейтаў. Запісаны сем альбомаў і адзін музычны праект. Музыка гурту ўвайшла ў 7 зборнікаў выканаўцаў старажытных мелодый. З 2003 г. распачаў працу і танцавальны склад гурту — тэатр „Яварына”, які ў час выступаў знаёміць гледачоў са старадаўнімі танцавальнымі традыцыямі.

Герой ці бандыт

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У кінатэатры з мірнай назвай „Pokój” тры вечары (8-10 чэрвеня) дэманстраваліся дакументальныя фільмы, якія не давалі спакою. Пра кранальныя, балючыя, незагойныя справы, пра якія некаторыя баяцца нават успамінаць або ахвотна забыліся б пра іх. У рамках „Клуба палітычнай крытыкі” прадстаўляліся творы Агнешкі Арнольд, знакамітай польскай дакументалісткі, адважнай даследчыцы сучаснай гісторыі, якая ставіць пытанні: адкуль бярэцца нацыяналізм, антысемітызм у галовах звычайных людзей, што робіць з іх вайна, чаму і ў найцяжэйшы час у людзях трымаюцца прыстойнасць і чалавецтва. Клуб палітычнай крытыкі ў супрацоўніцтве з гістарычна-сацыялагічным факультэтам Універсітэта ў Беластоку сарганізаваў гэтыя сустрэчы пад загалоўкам „Цяжкая памяць”, дыскусіі з удзелам аўтаркі і гісторыкаў. Паказаны былі фільмы „Суседзі” — аб забойстве ў Ядвабным яўрэяў рукамі суседзяў-палякаў, „Чорны ліпень” — пра пацыфікацыю фашыстамі падляшскай вёскі Крассова-Чэнсткі, „Ачышчэнне” і „Прабачэнне” — два фільмы пра валынскую разню па паляках, фільм аб прафесар Марыі Янён, думкі якой не заўсёды даспадобы „сапраўдным палякам” — „Бунт Янён”, ды фільм „Герой”.

У час дыскусіі (злева): Агнешка Арнольд, вядучая Малгажата Кавальская, Ян Ежы Мілеўскі і Славамір Іванюк

„Герой” распавядае гісторыю атрада польскага афіцэра, легенды Арміі Краёвай на Віленшчыне, капітана Рамуальда Райса, псеўданім „Буры”, які спаліў беларускія вёскі, а ў Залешанах, Шпаках, Занях закатаваў цывільных жыхароў — мужчын, жанчын і дзяцей, праваслаўных, якіх лічыў калабарантамі новай улады. У 1990-я гады польскі суд ануляваў прыгавор смерці, вынесены капітану Рамуальду Райсу, пакаранаму вайсковым судом у 1949 г. У фільме паказаны ваенна-партызанскі шлях Рамуальда Райса, прафесійнага вайскоўца, ад функцый у 3 Віленскай брыгадзе АК пад камандаваннем „Шчэрбеца”, да пасляваеннага змагання з новай уладай ды тымі, якіх лічыў калабарантамі. На тэму ягоных метадаў і рыс характару, якія развінуліся ў „спрыяльных” умовах вайны — такіх як жорсткасць, бязлітаснасць, а нават садызм, выказваюцца ў фільме ягоныя саратнікі. У кастрычніку 1944 г. у Беластоку явіўся ён быў у польскае войска пад фальшывым прозвішчам Ежы Гураль. Ад студзеня 1945 г. быў камандзірам атрада ў батальёне Аховы дзяржаўных лясоў у Гайнаўцы, дзе скантактаваўся з Зыгмунтам Шындзеляжам, пс. „Лупашка”, які ў той час аднаўляў 5 Віленскую брыгаду АК. 28 студзеня 1946 г. жаўнеры капітана Райса-„Бурага” дайшлі да вёскі Лазіцы, дзе наткнуліся на групу каля 40 фурманоў, што ехалі загатаўляць драўніну для школ і ўстаноў з вёскі Орля. Былі звольнены вазакі з горшымі коньмі і вазамі. Рэшта мела даць падводы для атрада ў бок Гайнаўкі. Па дарозе „Буры” загадаў звольніць фурманоў польскай нацыянальнасці, а праваслаўных загадаў расстраляць. На наступны дзень заатакаваныя былі вёскі Залешаны і Вулька-Выгаёўская, дзе расстраляны былі 16 асоб (таксама жанчыны і дзеці), 30 студзеня 1946 г. у лесе каля вёскі Пухалы-Старыя расстралялі 31 фурманаў (1 выжыў). 2 лютага 1946 г. атрад спаліў вёску Зані (забілі 24 асобы), Шпакі (9 асоб). У 1995 г. суд Варшаўскай вайсковай акругі ануляваў смяротны прыгавор у дачыненні да Рамуальда Райса, абгрунтоўваючы, што „змагаўся ён за непадлеглы быт польскай дзяржавы”, а выдаючы каманды адносна м.інш. пацыфікацыі беларускіх вёсак, дзейнічаў у сітуацыі *стану вышэйшай неабходнасці, прымушаючага да вырашэнняў не заўсёды этычна адназначных*. Камітэт сем’яў памардаваных фурманоў выступіў з ініцыятывай пабудовы помніка, на якім меў быць змешчаны надпіс: „W hołdzie pomordowanym przez zbrojne podziemie”. На пабудову ў той час не дазволіла тагачасная ваявода Крыстына Лукашук, аргументуючы, што ў выпадку прызнання прыгавору на „Бурага” за няважны, такі надпіс быў бы злоўжываннем...

У гарачай дыскусіі пасля фільма голас падняўся і ў рэжысёркі ў адказ на тое, што лішне было дакладна прадстаўляць эмоцыі пакрыўджаных сямейнікаў замардаваных фурманоў ды апісанне катаванняў (фурманы былі забіты таксама прыкладамі, друкамі, камянямі):

— Я не гісторык. Мяне ашарашвае, што выпраўлялі дзяржаўныя чыноўнікі свабоднай польскай дзяржавы, каб не ўзнік помнік памяці гэтым памардаваным людзям. Я гэта прасачыла, як яны — цягнуць, ашукваюць, гавораць паўпраўды. Адной справай з’яўляецца ануляванне прыгавору, але другая справа ў тым, як далёка гэты ідэалагічны націск уплывае на чыноўніка, які павінен быць бесстароннім. Гэта жахлівае і кампраметуючае. Я цешуся, што ўнутраны сэнс майго фільма пакрываецца з пазнейшым следствам ІНП. Людзі маюць права на роспач і плач, а тым больш на тлумачэнне тае роспачы. А польская вольная дзяржава кідае ім у вочы ілжу.

Агнешка Арнольд зрабіла гэты фільм і для свайго бацькі. Быў ён салдатам АК і да 1956 г. сядзеў у турме. Не меў нічога супольнага з НСЗ, НОВ ані з „Бурым”.

— Адкуль тое зверскае злачынства? На Віленшчыне не было такога зверства, нават былі пакаранні смерцю партызан, якія знуткаваліся над цывільнымі грамадзянамі. Я дашуквалася ў іхніх паводзінах зверства, выкліканага вайной. Партызанская вайна нясе ў сабе элемент насілля і жорсткасць у адносінах да насельніцтва. Гэта трагедыя, калі паводзіны Райса ідэалагізуюцца, ствараецца з яго нацыянальны герой, не звяртаючы ўвагі на цывільных людзей і іх памяць. Тады маем пекла. І такім чынам змяняецца гэта ў этнічную нянавісць.

Малады чалавек атлетычнай фігуры, які кожнае паўсказа паўтарае як завучаную мантру „to jest najważniejsze”: „Я з мешанай сям’і. Тут было паказана, што „Буры” забіваў праваслаўных, але гэта не да канца праўда. Ён расправіўся з асобамі, якія падтрымлівалі камунізм”. Агнешка Арнольд: „У фільме сказана па прозвішчах хто быў камуністам, а каго спалілі”. Іншы чалавек: „Нельга забіваць кагосьці толькі з-за таго, што належыць да нейкай партыі!” Ян Ежы Мілеўскі: „У час вайны гэта цяжэйшая справа. Калі хтосьці ангажаваўся палітычна з уладай, з якой змагалася падполле, мог спадзявацца рэпрэсій!”

— У нашай вёсцы не было ні аднаго партыйнага, — сказала жыхарка Заняў, якой брата замардавалі жаўнеры „Бурага” на Лазіцах. Не кажыце, што веравызнанне не мела значэння. Яны не глядзелі ці хто партыйны быў ці непартыйны, пабілі ўсіх як аднаго. (...) Цяпер гэтых *драняў*, што мы бачылі на гэтым фільме, няма што караць. Хай Госпад іх пакарае. Мы ўжо не будзем іх караць. Але нам належыцца кампенсацыя. Але мы не маем права на тое. От, і маеце *вольнасць*. Не кажыце, што Польшча нас шануе. Гэта палякі ўстанаўлялі камуну, не мы.

„Ліцьвін”: — Гэта быў генацыд, а „Буры” гэта садыст (як сцвярджаюць самі ягоныя калегі з віленскага АК). Фурманоў закатавалі сякерамі, калкамі і чым там яшчэ, пра што ведаюць самі каты і, мабыць, іхнія дзеці. Было гэта забойства такое як на Валыні, у Бяшчадах, на Балканах, у Афрыцы ці ў Ядвабным, так забіваюць „суседзі” з-за плота, з-за мяжы і гэтак далей. Войска страляе, а садыст (?) бярэ кол і лупіць па галаве. Гэта ў Харватыі банда ездзіла ад вёскі да вёскі, выбірала з нацыянальна мешанай кампаніі гэтых зненавіджаных, станавіла ў рэчцы для прыкладу і валіла молатам у чэрап. Столькі гадоў ад таго часу, а ў этнічных чыстках прымяняюцца такія самыя прылады, схемы. Гэта было 60 гадоў таму, а што маем цяпер? У дэмакратычнай, інтэлігенцкай і поўнасцю каталіцкай дзяржаве маем цалкавіты недахоп спачування пакрыўджаным сем’ям, боль гэтых людзей які ж пранізлівы (траўма пасля падзеі і злавеснае маўчанне 50 гадоў) нейтралізуецца „вышэйшымі мэтамі змагання з камунай”. „Пан з ІПН” дбае пра тое, каб нічога не гаварылася на тэму тэхнікі катавання. Чаму няма рапарта крымінальнага лекара з эксгумацыі, — ёсць жа стандартныя працэдуры? Спадар з ІПН, ці перажываючы штогод смерць Хрыста, ты падумаў аб бедных людзях з польска-беларускага пагранічча? Яго таксама закатавалі „суседзі”... Ці падумаў ты, як гэта магло адбывацца? Я падумаў і набраў дыстанцыі да такіх падзей. У такіх месцах як пагранічча вось ёсць такі прынцып: КАТ гэта моцны сусед, а АХВЯРА гэта той слабейшы. І калі б сітуацыя адмянілася, беларусы з такіх вёсак адпомсцілі б, толькі ў гэтым выпадку быў арбітр УБ і не дапусціў да эскалацыі забойстваў. „Буры” гэты толькі дробны бандзюга, які папхнуў суседзяў да калектыўнага злачынства. Пазбяганне высвятлення пакідае далей нарыў, які, калі б разліўся, прынёс бы які благі час! Толькі цікава, на якім баку будуць нашы дзеці — КАТАЎ ці АХВЯР?

Сівы чалавек:

— Фільм пані Арнольд варта паставіць у прыклад гісторыкам. Мне здаецца, што паміж гісторыкам і палітычным агітатарам вельмі тонкая мяжа. Так як паміж успомненым партызанам і бандытам *(апладысменты залы)*. Калі суддзя і гісторыкі рэабілітавалі асуджанага за злачынствы „Бурага” — гэты суд быў ідэалагічны. Часам мне здаецца, што камусьці зноў хацелася б пайсці спаліць якую-небудзь вёску.

Гісторык Ян Ежы Мілеўскі:

— Пракурор з ІНП заявіў, што гэта было злачынства генацыду. Сітуацыя вяртаецца да нормы ў ацэнках. Пасля амаль дваццаці гадоў нават тыя, што праслаўлялі „Бурага”, мяняюць свой погляд.

Памерла Людвіка Дзяржынская

11 чэрвеня ў Варшаве на 102 г. жыцця памерла Людвіка Дзяржынская, пляменніца Янкі Лучыны. Яе бабуля Антаніна была роднай сястрой паэта, а маці Ванда — роднай сястрой Антона Нэканды-Трэпкі.

Людвіка Ружа нарадзілася 12 жніўня 1908 г. у Мінску. У родным горадзе пасля была толькі двойчы — у 1912 і 1915 гг. Да першай сусветнай вайны жыла з бацькамі ў мястэчку Тукум каля Рыгі, дзе бацька Адам Дзяржынскі, дваюрадны брат Фелікса, быў суддзёй. Падчас I сусветнай вайны выехала з маці ў Курск да Юльяна Неслухоўскага, брата Янкі Лучыны. Ён там быў інжынерам-лесніком. Меў жонку Ванду і двух сыноў. Сп. Людвіка памятала як на каляды 1917 г. прыбегла ў хату служанка Юльяна з крыкам, што бальшавікі забілі пана. Перачакаўшы там вайну і рэвалюцыю, спярша прыехалі ў Варшаву, а пасля пасяліліся ў Вільні. Яе маці Ванда была настаўніцай, а бацька працаваў у судзе. Жылі пры вуліцы Антокальскай, 44. Людвіка ў 1932 г. закончыла права на Віленскім універсітэце. У 1933 г. памёр яе бацька (пахаваны на Антокальскім могільніку ў Вільні). Людвіка да вайны працавала памочнікам сакратара ў гродскім судзе ў Вільні, пасля вайны — у Дзяржаўнай рэпатрыяцыйнай установе. Аформіла таксама і сабе паперы на выезд у Варшаву, дзе жыла з маці пры вул. Слупэцкай. Працавала ў кааператыве „Крушыва". Яе маці Ванда памерла 29 красавіка 1961 г. Перад смерцю спісала ўспаміны пра Янку Лучыну, Антона Нэканду-Трэпку і іншых членаў сям'і Неслухоўскіх і Нэкандаў-Трэпкаў. Прадставіла ў іх Мінск на пераломе XIX і XX ст.ст., Жацерава — маёнтак, які арандавалі Неслухоўскія, і міжваенную Вільню. Публікаваліся яны ў польска-беларускім „Czasopisie" (2006, nr 7-8, s. 35-38; nr 9, s. 29-31; nr 10, s. 32-34; nr 11, s. 29-30; nr 12, s. 36-37) і сталі крыніцай новых звестак пра Янку Лучыну і яго радню. Людвіка захоўвала іх амаль 50 гадоў — зараз трапілі яны ў Архіў-музей літаратуры і мастацтва ў Мінску, так як і вельмі рэдкія ды невядомыя здымкі з сямейнага альбома, на якіх Янка Лучына і яго радня. Пра адзін з такіх здымкаў я пісала ў „Ніве" (№ 50 ад 16.12.2001 г., с. 1, 4).

З Людвікай Дзяржынскай я пазнаёмілася ў 1998 г. 2 лютага адведала яе ў Варшаве. Жыла сама, хаця было ёй тады 90 гадоў. Расказала пра ўсю сям'ю Неслухоўскіх — пра Генрыка, брата Яна, які меў дачку Ядвігу (нар. 26.06.1891 г.), жонку віленскага ваяводы Уладыслава Рачкевіча. Генрык быў адвакатам і вельмі любіў жанчын. У міжваенны перыяд жыў у Вільні і ажаніўся з медсястрой і меў з ёй дачку Генрыку (па мужу Родкевіч), якая пасля II сусветнай вайны жыла ў Кашаліне і заснавала там тэатр „Дыялог". Мне асабліва цэннымі былі яе ўспаміны пра дзядзьку Антона Нэканду-Трэпку, які беларускую свядомасць узяў ад Янкі Лучыны. Паэт перадаў яму замілаванне да беларускага народа ў такой ступені, што той у міжваенны час у Вільні актыўна ўключыўся ў беларускі нацыянальны рух.

Партрэт Юліі і Антона Нэкандаў-Трэпкаў стаяў у яе на пачэсным месцы. На сцяне вісеў малюнак яе маці з выявай дворыка ў Жацераве.

Пару разоў я наведала сп. Людвіку ў Варшаве, пакуль не трапіла яна ў дом для састарэлых, калі не была ў стане самастойна жыць. П'ючы гарбату з мінскіх сямейных філіжанак, адчувалася атмасферу таго часу, у якой прысутнымі былі і Янка Лучына, і яго пляменнік Антон Нэканда-Трэпка, і ўся іхняя радня, якая дасюль жыве рассеяная па Польшчы.

Паховіны сп. Людвікі Дзяржынскай адбудуцца ў пятніцу 19 чэрвеня на Павонзках у Варшаве.

Лена ГЛАГОЎСКАЯ
Гданьск, 14.06.2009 г.

Беларусь,беларусы...

Пэўна ніхто з нас у дзяцінстве не мог паставіцца абыякава да спектакляў, якія ладзілі дзіцячыя тэатры. Суперажыванні за добрых персанажаў і негатыўнае стаўленне да злых фармавалі ў нас далейшыя адносіны з добрымі ці злымі людзьмі.

Дзейнічае у Беларусі тэатр, які добра вядомы маленькім тэатралам з цэлай краіны. Гэта — Тэатр юнага гледача. Менавіта да яго прывозяць дзяцей з розных куткоў Беларусі, каб паглядзелі яны тэатральнае ўвасабленне казак ці гісторый, пра якія ім калісьці чыталі кніжкі мамы і таты.

Віртуальна пазнаёміцца з Тэатрам юнага гледача дапамагае ягоны сайт, што месціцца па адрасе http://beltuz.by/be. Адразу варта адзначыць, што галоўная старонка сайта выглядае як нешта сярэдняе паміж афішай і малюнкам да якой-небудзь казкі. На ёй змяшчаецца практычна ўся найважнейшая інфармацыя пра спектаклі, падаюцца навіны і нават распавядаецца пра некаторых акцёраў. Цэнтральнай фігурай на выяўленні з'яўляецца абуты ў кеды анёл, які носіць акуляры і трымае парасон.

Дарэчы, на галоўнай старонцы ўсё зроблена даволі зручна — тут ёсць нават магчымасць заказаць квіткі на выбраны спектакль.

Як мае быць, з левага боку месціцца выйсці да іншых рубрык. Найбольшую цікавасць для знаёмства з тэатрам выклікае старонка „Пра тэатр". Там змешчаны невялікі расповед пра яго гісторыю. „Гісторыю Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача расколола Другая сусветная вайна: першы Тэатр юнага гледача адчынены ў Менску ў 1931 г. і праіснаваў да ліпеня 1941 г., — распавядаецца на старонцы. — У 1956 г. Беларускі ТЮГ адкрыў свае дзверы ізноў, а ў 2006 г. афіцыйна адзначалася ягонае пяцідзесяцігоддзе. Нягледзячы на маштабную рэканструкцыю, якая распачалася пры канцы 2008 г., тэатр паспяхова гастралюе і паказвае свае спектаклі на розных пляцоўках беларускай сталіцы: у Рэспубліканскім палацы культуры прафсаюзаў (пр-т Незалежнасці, 25) і ў Доме літаратара (вул. Фрунзе, 5). Рэканструкцыю плануецца завяршыць да 2011 г., цалкам захаваўшы аблічча помніка архітэктуры, якім з'яўляецца будынак ТЮГа".

Паколькі сцэна тэатра ў даны момант на рамонце, то ў наступнай падрубрыцы даецца інфармацыя аб тых месцах, дзе выступаюць акцёры тэатра ў Мінску. Іншая падрубрыка дае спіс тэлефонаў адміністрацыі тэатра.

Зразумела, для наведвальнікаў тэатра найбольш цікавым будзе расповед аб тым, якія спектаклі і калі будуць іграць акцёры ТЮГа. Інфармацыю аб гэтым можна знайсці на старонцы „Афіша". Там указваюцца не толькі дні, калі ідуць спектаклі, але і даецца невялікая анатацыя да іх. Адтуль таксама мы даведаемся, якая мова будзе гучаць са сцэны — беларуская ці руская.

Падобнай на рубрыку „Афіша" з'яўляецца старонка „Рэпертуар", дзе месціцца інфармацыя аб усіх спектаклях, што праходзяць у Тэатры юнага гледача. Калі клікнуць на рысунак, што даецца да кожнай назвы спектакля, то перад намі адкрыецца больш поўны расповед пра гэтую тэатральную імпрэзу.

Рубрыка „Персаналіі" прысвечана тым, хто з'яўляецца жывым увасабленнем ТЮГа — акцёры, адміністрацыя і тэхнічны персанал. Клікнуўшы на фотаздымак кожнага з іх, мы можам пазнаёміцца з іх творчай і працоўнай біяграфіяй.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

З вялікай напругай

Даўно вядомая ісціна, што паўтарыць дасягненне ў спорце куды цяжэй, чым дамагчыся поспеху першы раз. Жаночая зборная Беларусі па баскетболе — гэта ўнікальная каманда. Усе яе заваёвы былі дасягнуты насуперак стану існых рэчаў. Насуперак таму, што нацыянальнае першынство чахне з сезона ў сезон, фактычна ў ім гуляюць дзеці, насуперак таму, што гэты від спорту з'яўляецца адным з найбяднейшых у Беларусі, насуперак таму, што кіруюць айчынным баскетболам малакампетэнтныя людзі.

Пасля таго, як дзяўчаты Анатоля Буяльскага два гады таму сталі бронзавымі прызёркамі кантынентальнага першынства, потым заваявалі пуцёўку на пекінскую алімпіяду (у што многія не верылі) і ўрэшце на кітайскіх гульнях увайшлі ў лік васьмі мацнейшых дружын свету, наступіў і пэўны псіхалагічны злом. У тым сэнсе, што баскетбалісткі з аднаго боку, праўдападобна, уткнуліся ў столь максімальнага выніку, а матывацыя паўтору дасягненняў заўсёды слабейшая. Да таго бальшыня дзяўчат з асноўнай абоймы правяла досыць паспяховы, але цяжкі клубны сезон. Але галоўнай праблемай з'яўляецца нераўнамернасць у лініях і стомленасць ад траўмаў. Пры ўсёй павазе да распасоўшчыц Наталлі Марчанкі і Вольгі Падабед, росту іх майстэрства ўжо не будзе. Іншая рэч, што на гэтую пазіцыю іншых вартых прэтэндэнтак і блізка няма. Перад чэмпіянатам Еўропы, які зараз праходзіць у Латвіі, беларуская каманда страціла да ўсяго пару баскетбалістак абарончага амплуа. Надзея Дрозд згубілася дзесьці на прасторах Польшчы, а асабліва вострай стала адсутнасць з-за траўмы Вольгі Масілёніне.

У такой сітуацыі асноўная надзея ўскладаецца на пярэдні край. І трэба сказаць, што Наталля Трафімава, Настасся Верамеенка, Марына Крэс і Алена Леўчанка ў цэлым выконваюць сваю місію. Але выступы ў групе на першым этапе склаліся няўдала. Адолеўшы ў стартавым паядынку Ізраіль — 81:76 (лепшым снайперам тут стала Тацяна Троіна — якраз чэмпіёнка Ізраіля апошняга года — 16 ачкоў), нашы дзяўчаты пасля ў авертайме прайгралі Францыі (камандзе, якая прагрэсуе і лічыцца адной з фаварытак), а затым саступілі і ніжэйшай па класе Італіі. У выніку ў другі этап беларуская дружына выйшла з трэцяга месца з нулём у графе „перамогі". На стадыі далейшай кваліфікацыі беларускі спасавалі перад дзейснымі чэмпіёнкамі Еўропы расіянкамі — 51:66, а затым з цяжкасцю ўзялі верх над камандай Літвы — 61:55. На момант напісання гэтых радкоў выхад у чвэрцьфінал залежаў ад зыходу апошняга матча з Турцыяй. Прытым расклад быў досыць мудрагелістым і нават вікторыя над малаазіяткамі не гарантавала запаветнай пуцёўкі ў плэй-оф. Дарэчы, перад топ-турнірам беларускі саступілі турэцкім дзяўчатам у шэрагу таварыскіх спатканняў. Шаноўны чытач ужо будзе ведаць ці ўдалося выхаванкам Буяльскага насуперак траўмам (яны трывожылі некаторых дзяўчат і падчас першынства) і неспрыяльнай сітуацыі скінуць напругу і зноў прадэманстраваць свае лепшыя валявыя і гульнёвыя якасці. Наша каманда магла і заўчасна пакінуць турнір і здзейсніць чарговую сенсацыю ў чвэрцьфінале. У кожным разе яна заслугоўвае павагі і шанавання.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Прыкладныя вынікі выбараў у Еўрапарламент у некаторых падляшскіх гмінах

Lp.	Гміна	Яўка	ГП	ПіС	СЛД-УП	ПСЛ	Сычэўскі Ян	Мірановіч Антон
1.	гміна Белавежа	17,9	136	66	73	28	25	24
2.	Беласток горад	31,2	31708	22576	8115	1966	968	2827
3.	Бельск-Падляшскі горад	18,4	1268	1206	1093	146	424	487
4.	гміна Бельск-Падляшскі	12,1	104	267	246	79	180	50
5.	гміна Боцькі	18	101	373	90	57	58	31
6.	гміна Васількаў	24,1	1050	973	171	93	22	73
7.	горад Гайнаўка	17,8	1355	529	970	140	398	383
8.	гм. Гайнаўка	14,3	158	22	184	67	123	81
9.	гм. Гарадок	15,3	316	80	226	26	105	145
10.	гм. Дубічы-Царкоўныя	10,7	42	10	40	50	24	32
11.	гм. Заблудаў	16,6	337	519	77	99	29	75
12.	гм. Кляшчэлі	14,6	119	51	100	25	57	81
13.	гміна Крынкі	20,8	118	266	61	79	18	20
14.	гміна Мельнік	13,7	88	84	79	20	46	34
15.	гміна Мілейчычы	18	125	64	66	39	28	94
16.	гміна Міхалова	20,4	485	267	165	113	72	199
17.	гміна Нараўка	11,2	147	32	109	40	60	49
18.	гміна Нарва	10,7	140	76	68	31	29	94
19.	гміна Нурэц-Станцыя	10,4	111	76	101	38	38	22
20.	гміна Орля	13,6	143	13	146	26	99	103
21.	гміна Саколка	17,7	1030	1150	302	1017	34	55
22.	гм. Супрасль	25,1	1153	717	290	126	46	230
23.	Сямятычы г.	19,8	812	912	340	158	105	179
24.	гміна Сямятычы	13,3	109	315	100	64	40	25
25.	гм. Чаромха	12,5	143	29	129	22	42	61
26.	гміна Чыжы	11,3	40	6	76	89	52	25

Дні нараўчанскіх пенсіянераў

У Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы (Гайнаўскі павет) 8 мая г.г. адбылося ўрачыстае святкаванне Дня інваліда, якое арганізавала Раённае праўленне Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў. Прыйшлі і прыехалі члены ПСПіІ з Нараўкі, Ляўкова, Плянты, Семяноўкі, Міклашэва, Гушчэвіны, Альхоўкі ды Стачка. Сонечнае, цёплае надвор'е паспрыяла і сабралася многа людзей. Дадам, што арганізацыя людзей у пенсійным узросце тут вялікая — у пару соцень асоб.

Сустрэчу вяла старшыня Раённага праўлення ПСПіІ у Нараўцы Ядвіга Карпюк. Прывітала яна старшыню Акруговага праўлення ПСПіІ ў Беластоку Яна Каліноўскага ды членаў раённага праўлення ПСПіІ ў Нараўцы Люцыну Зданоўскую, Яўгена Смольскага, Яна Целушэцкага, Мікалая Варанецкага і Паўла Леўшу.

Старшыня беластоцкага АП ПСПіІ ў Беластоку Ян Каліноўскі расказаў аб тым, чым займаецца Акруговае праўленне і якія робіць намаганні, каб пенсіянерам лепш ды прыемней жылося. Пажадаў моцнага здароўя і заахвочваў да ўдзелу ў таварыскіх сустрэчах, танцавальных вечарынах ды краязнаўчых экскурсіях, м.інш. у модныя Друскенікі (Літва).

Уручыў ён Залатыя пачэсныя значкі ПСП пенсіянерам-актывістам — Аляксандру Зданоўскаму і Антону Конкелю, а таксама музычнаму кіраўніку фальклорнага калектыву „Нараўчанкі" Пятру Скепку. Усе праспявалі „Многае лета".

Каб было весела ды прыемна, дык спявалі прыгожыя беларускія песні „Нараўчанкі" Зіна Пацэвіч, Галена Апольская, Вольга Раманюк і гарманіст Пятро Скепка. Спявалі таксама ўсе разам прыгожыя застольныя песні. А пачастунак быў багаты — еш колькі хочаш ды заўсёды вельмі смачнае!

Была яшчэ рэчавая латарэя. І ўсе выйгравалі! А білет каштаваў усяго 2 злоты.

Прыемна было сустрэцца старэйшым людзям і інвалідам з усяе Нараўчанскае гміны. Прывітацца і перакінуцца слоўцам.

Неўзабаве адбыліся чарговыя імпрэзы: сустрэча пенсіянераў у Семяноўцы (ладзілі яе мясцовыя дзеячы) — у пленэры на беразе Семяноўскага вадасховішча; забаўляльнае мерапрыемства „Прывітанне лета" на лясной паляне ў прыгожай мясціне сярод Белавежскай пушчы ў Тапіле; а таксама экскурсія на Літву ў аквапарк у Друскеніках.

(яц)

Хто стукае, таму адчыняюць...

У 12 нумары „Нівы" ад 22 сакавіка друкаваўся мой тэкст „Дбаюць за інтэрэсы", у якім я пісаў, што казначэйская ўстанова ў Гайнаўцы не звярнула мне належнай пераплаты 7 зл. з падаходнага падатку за мінулы год. Сёлетні разлік я паслаў поштай, як і ў мінулым годзе. У канверт палажыў картачку з прыпіскай, каб справу высветлілі па тэлефоне або электроннай пошце. На вынік не прыйшлося доўга чакаць. Вось які адказ атрымаў я па э-мэйлу: „Witam! Nadpłata wynikająca z zeznania PIT-37 za 2007 r. w wysokości 7 zł jest zaksięgowana na Pana koncie szczegółowym. Nadpłata nie została zwrócona ze względu na art. 77b § 3 Ustawy Ordynacja podatkowa (Dz. U. z 2005 r. Nr. 8 poz. 60 ze zm.), zgodnie z którym nadpłata, której wysokość nie przekracza kosztów upomnienia (tj. kwoty 8,80 zł) w postępowaniu egzekucyjnym, podlega zwrotowi wyłącznie w kasie (nadpłata wynikająca z zeznania za 2007 r. wynosi 7 zł). Kasy w Urzędzie Skarbowym w Hajówce nie ma. Jednakże zwrot powyższej nadpłaty wraz z nadpłatą wynikającą z zeznania za 2008 r. zostanie zwrócony na wskazany przez Pana rachunek bankowy. Pozdrawiam. Grażyna I."

Толькі са службовай пісулькі я даведаўся. Дзякуй і за гэта! Разважаю затым, што было б, калі б я гэтых сем злотых не дапамінаўся. Ці чыноўнікаў не абавязвае закон даць адказ на працягу двух месяцаў? Мяркую, што, калі б я не заплаціў 7 зл. у касу, мяне абцяжарылі б коштамі напаміну (8,80 зл.) ды далічылі б працэнты. Аб гэтым шаноўная панечка не напамінае. А дзеля справядлівасці скажу, што жонка аднавяскоўца Міхася Б. вымушана была поштай паслаць у казначэйскую ўстанову ў Гайнаўку адзін злот недаплаты з сёлетняга разліку (не пытаўся колькі заплацілі за перавод). Ці не праўда, што напамінае нам народная мудрасць, што „не ўсім усё даваляецца"?

Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка



1. горад між Беластокам і Гроднам, 2. мучны выраб з рэдкага цеста, спечаны па патэльні, 3. правы прыток Дняпра ў Талачыне, 4. круглая пласцінка з золата, серабра або бронзы, якая выдаецца першым траім алімпійскім прызёрам, 5. раённы горад на Сажы між Оршай і Суражам, 6. вялікая рака, што ўліваецца ў Азоўскае мора, 7. вартасць наяўнай і даўгавой маёмасці прадпрыемства, 8. работнік для выканання даручэнняў пана, 9. гарачая пара года, 10. фанабэрыстасць, ганарыстасць, 11. масіўны брус, які кладуць пад рэйкі, 12. лёгкае хістанне воднай паверхні, рабізна на ёй, 13. Вікторыя, вядучая беларуская тэнісістка, 14. яма, 15. партнёр прадаўца, 16. сяброўка эпікі і драмы, 17. вязкая маса з мукі, замешанай на вадкасці.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — персідская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 20 нумара

Газета, дыба, сайт, цар, цырк, Чака, шыла.

Рашэнне: **Здабычай тыгра карыстаецца шакал.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 200 egz.

XXIII Сустрэчы „Зоркі", Новае Ляўкова (Бора-Здруй), 05-10.06.2009 г. Тэма : Белавежская пушча — слова і вобраз

Фотарэпартаж у аб'ектыве Ганны Кандрацюк, Тамаша Ляшкевіча і Кароля Лукшы

Памятны здымак з галоўным рэдактарам „Нівы"

Памаліліся ў Крыначцы

Дзякуем раднаму Славаміру Кулешу

З „Зоркай" у пошуках блюшчу

Увага! Засяроджанасць! Думка!

Карэктура пад вокам Валі Бабулевіч...

...і паляцелі галоўкі

Габрыся Налівайка — наша запявала

„Многае лета" Коры, Ілоне і Пятру!

Кніжка Надзеі Артымовіч на дарогу...

...якую апісалі рэдакцыі „Аранжавай хаткі" і „Павуціння"

20.06 — 26.06

(22.03. — 20.04.) Да 23.06. будзеш у дасканалай форме. Шчасце і ў фінансах, і ў пачуццях. Ідэальны час на новыя інвестыцыі. 20-24.06. — ідэальны момант на абдуманыя дзеянні. Даб'ешся поспеху, зраэлізуеш свае амбіцыі і без цяжкасцей завершыш планаваныя намеры.

(21.04. — 21.05.) 19-23.06. будзеш проста ў сёмым небе. Захоплены добрым абаротам спраў, заразіш сваім аптымізмам іншых. У каханні проста фантастычна! З 23.06 да 27.06. ненайлепшы час для навукі і экзаменаў.

(22.05. — 22.06.) Не афармляй нічога сур'ёзнага 23-27.06., асабліва вялікіх праектаў, замаруджвацца могуць і дробныя справы. Насі камень рубін, шчаслівы лік 2. Пазбягай нават размоў пра хваробы, не лячыся самапасам.

(23.06. — 23.07.) Выдатны час на стратэгічныя рашэнні пры маладзіку Месяца (22.06.). З 20.06. будзеш вельмі засяроджаны, здольны справіцца з рознымі праблемамі. Дзякуючы непахіснай волі і моцы характару ўсё пераможаш. Час радасці, аптымізму, веры ў сябе. Будзеш задаволены, а твае паводзіны памогуць шмат здабыць.

(24.07. — 23.08.) 20-24.06. будзеш у змозе максімальна ангажавацца ў кожнае мерапрыемства. 21-25.06. не дазволь нікому над сабой дамінаваць, асабліва на працы. Будзь асабліва асцярожны пры фінансавых спакусах ад асоб падазронай рэпутацыі.

(24.08. — 23.09.) 19-23.06. будзеш мець вялікае адчуванне сітуацыі, у галаву заляцяць табе вельмі цікавыя ідэі і праекты. Але з 24.06. (аж да 28.06.) могуць на цябе навальвацца сумненні, песімізм, думкі пра бязмэтнасць дзеянняў. З 20.06. да 24.06. — найлепшыя рандэву, і знаёмствы не на адзін дзень ці ноч.

(24.09. — 23.10.) Мілыя і карысныя падарожжы, але лепш пільнавацца працы і трымаць руку на пульсе — можаш шмат здабыць, але і шмат страціць. Маладзік Месяца (22.06.) можа аказацца крытычным для сямейных спраў. Не паддавайся націску хатніх і не дай сабе падрэзаць крылаў, калі адчуваеш, што дзякуючы адважным дзеянням можаш шмат здабыць.

(24.10. — 22.11.) Для Скарпіёнаў-студэнтаў вельмі добры час — вы здольныя да высілку, а страх перад паразай будзе допінгам. Некаторыя знаёмыя могуць цябе расчараваць. Хоць з усіх сіл схочаш падтрымаць каханую асобу, нават вялікім коштам самога сябе. 21-25.06. твая патрэба панавання над іншымі можа стаць маніяй. Маніпуляванне інфармацыямі раней ці пазней рассакрэціцца.

(23.11. — 22.12.) Твае планы могуць стаць адлеглымі. Апетыт на вялікія грошы можа давесці цябе да працагалізму! Найбольш можаш дасягнуць, быўшы сціплым і памяркоўным. Будзь свядомым сваіх абмежаванняў, але і якасцей.

(23.12. — 20.01.) 20-24.06. здабудзеш сэрца каханай асобы. Твой козыр — непахісная прынцыповасць, вернасць, трываласць, а таксама манеры. Умела спалучыш прыемнае з карысным, са свайго зацікаўлення можаш мець грошы. З 24.06 (аж да 28.06.) не плануй важных ходаў, адтэрмінуй сустрэчы, асабліва ва ўстановах.

(21.01. — 19.02.) Засяродзься на здароўі (аж да канца чэрвеня). Умела загарай, каб не спаліцца. Добры час на водпуск, з сям'ёй ці кампаніяй. Хістка ў фінансах; не чапай жалезнага запасу.

(20.02. — 21.03.) Плённы час у каханні. Падарожжы вучаць: усюды добра, а найлепш дома. Сябры зайздросныя за час, які ты правядзеш без іх. Грошай пад дастаткам. Пашчасціцца нават у безнадзейных справах.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960